Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 324 (4230)
Пятніца, 4 сьнежня
1931 г.

Сеньня у нумару

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Заваяваць канчатковую перамогу ў збожжазагатоўках (1-я стар.). ГУРЖЫ—Шляхі рэканструкцыі садова-гароднай прамысловасьці (2-я стар.). СЬВІРЫДАЎ—Чарговыя задачы лясной прамысловасьці (3-я стар.).

Пасеўную 1932 году сустрэць у баявой гатоўнасьці (1-я стар.).

Вышэй арганізатарскую і кіруючую ролю нізавых партзьвеньняў на бытворчасьці (2-я стар.).

Чэрвеньшчына павінна рапартаваць зьлёту (2-я стар.)

Рашучай ліквідацыяй абязьлічкі вагонаў павысім іх карысную работу (3-я стар.).

КІТАЙ: Замест эвакуацыі—новыя брыгады ў Манчжурыю (4 стар.).

Заваяваць канчатковую перамогу ў збожжазагатоўках

Барацьба за бальшавіцкую арганізацыю збожжазагатоўчай кампаніі, а мабілізацыю мас калгаснікаў і аднаасобнікаў на поўнае і першачарговае выкананьне заданьняў па здачы (продажы) збожжа дзяржаве зьяўляецца важнейшай неадрыўнай часткай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў, за далейшыя перамогі на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Посьпех загатовак ня толькі вызначае сабою посьпех выкананьня вытворчых праграм трэцяга рашаючага, але і ў значнай частцы прадрашае тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў чаньвертым, заключным годзе пяцігодкі.

Вось чаму партыя адлае збожжазагатоўкам максымум увагі, і па якасьці правядзеньня гэтай кампаніі судзіць аб баяздольнасьці тай ці іншай партарганізацыі. Аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б катэгарычна патрабаваў, **«каб кожны член партыі вёў шырокую растлумачальную масавую работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў аб іх абавязках у здачы (продажы) пралетарскай дзяржаве сельска гаспадарчай прадукцыі».**

Перадавыя калгасы, саўгасы, сельсаветы і раёны паказалі прыклад сапраўды бальшавіцкай барацьбы за збожжа. Даволі ўказаць на такія раёны, як Сураскі, які выканаў 142,3 проц. гадавога пляну, Асьвейскі—126 проц., Уваравіцкі—100,3 проц., Бешанковіцкі—94,2 проц., Гарадоцкі—95,7 проц. і г. д.

Гэта вынік наўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, бязьлітаснага змаганьня з правым і «левым» апартунізмам, з прымірэнцтвам да іх, арганізацыі мас калгаснікаў і аднаасобнікаў на рашучую барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі.

У радзе раёнаў **(Плешчаніцкі, Заслаўскі, Сененскі, Сіроцінскі, Чэрвеньскі** і інш.) за апошні час дасягнут значны зрух у ходзе кампаніі. Гэтыя раёны значна павялічылі тэмпы здачы збожжа і набліжаюцца да выкананьня сваіх заданьняў.

Аднак, у цэлым па рэспубліцы яшчэ няма неабходнага пералому ў збожжазагатоўках. На 1 сьнежня гадавы [illegible] у сярэднім па БССР выкананьне усяго на 60,6 проц., між тым, паводле дырэктывы партыі і ўраду, да гэтага часу павінна было быць загатоўлена ня менш 90 проц. пляну.

Тэмпы загатовак за апошнія пяцідні ня толькі не ўзьмаліся, але, наадварот, яшчэ больш зьнізіліся. За шосты пяцідзеньку лістапада загатоўлена збожжа складала 2,2 проц. гадавога пляну, за 4-ю пяцідзеньку—0,9 проц., за пятую — 1,8 проц. і за шостую—1,5 проц.

Пры аналізе выкананьня пляну па гарох перш за ўсё кідаецца ў вочы [illegible] **адставаньне саўгасных сыстэмы.** Саўгасы БССР выканалі гадавое толькі на 34,1 проц.

Часу апублікаваньня пастановы КП(б)Б аб загатоўках і зьмены курсу апартуністычнага кіраўніцтва саўгастрэсту прайшло ўжо звыш месяца. Тэрмін зусім вystарчальны каб пераламаць перабудовы работы сельскай сыстэмы, для арганізацыі здачы баявой здачы збожжа саўгасамі. Аднак, новае кіраўніцтва больш месяца рэарганізацыяй цэнтральнага апарату Белсаўгастрэсту (які складаецца па тры паасобныя сыстэмы), самой арганізацыяй збожжазагатовак і ліквідацыяй адставаньня саўгасаў. Дагэтуль яшчэ вельмі мала зроблена для разгортваньня масавай работы ў саўгасах, для мабілізацыі саўгасных рабочых на барацьбу за свячасовы абмолот і поўнае выкананьне пляну здачы таварнага збожжа.

Практыка былога апартуністычнага кіраўніцтва Белсаўгастрэсту пусьціла карэньні і ў работу многіх саўгасаў. Буржуазныя тэндэнцыі супроцьпаставіць рвацкія, месьніцкія інтарэсы агульным інтарэсам пралетарскай дзяржавы, далёка яшчэ ня зжыты. Чым, як ня гэтым можна вытлумачыць такія факты, што 18 саўгасаў Случчыны — буйнейшага збожжазагатоўчага раёну дагэтуль не здалі дзяржаве піводнага цэнтнэра збожжа, што ў радзе саўгасаў Аршанчыны, Койданаўшчыны, Вушаччыны маюць месца апартуністычныя спробы ашукаць дзяржаву, затрымаць як мага больш збожжа «на ўсякі выпадак».

Гэтыя факты выразна сьведчаць аб тым, што кіраўнікі многіх саўгасаў не зразумелі вядучай ролі сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў загатоўках, выключнай палітычнай важнасьці поўнай і свячасовай здачы саўгасамі таварнай прадукцыі; **«абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве разглядаліся кіраўнікамі саўгасаў, як другарадная задача, выкананьне якой можна адкласьці да поўнага задаваленьня патрэб сваёй гаспадаркі»** (з пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб рабоце збожжавых саўгасаў).

Партыя патрабуе карэннага пералому ў збожжазагатоўках. Гэтага пералому абавязаны неадкладна дабіцца партыйныя арганізацыі саўгасаў і кіраўніцтва саўгасных сыстэм. Яны абавязаны забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне дырэктывы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб **«абавязковай здачы саўгасамі вызначанай плянам загатовак прадукцыі не пазьней 10-га сьнежня».**

Гэта магчыма толькі пры рашучай перабудове работы саўгасаў пад знакам наўхільнага ажыцьцяўленьня пасьці ўказаньняў тав. Сталіна, пры ўмове неаслабнай барацьбы з месьніцка-спажывецкімі тэндэнцыямі.

Трэба бязьлітасна гнаць з радоў партыі апартуністаў—буржуазных перараджэнцаў, тых, з дазволу сказаць «кіраўнікоў», якія, выконваючы волю клясавага ворага, прабуюць сарваць збожжазагатоўчыя пляны.

Калгасны сэктар таксама зьяўляецца адсталым вучасткам збожжазагатоўчай кампаніі. Сотні перадавых калгасаў, якія па-бальшавіцку ацанілі важнасьць загатовак, датэрмінова выканалі і перавыканалі свае заданьні па здачы збожжа дзяржаве. Гэта было забясьпечана там, дзе кіруючыя партыйныя і калгасныя арганізацыі зразумелі новую абстаноўку, у якой праходзіць збожжазагатоўчая кампанія гэтага году, у сувязі з пераможным калгасным рухам, з вялізарнымі дасягненьнямі на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Посьпех збожжазагатовак дасягнут там, дзе ўявілі, што цяперашняя барацьба за збожжа ў калгасах павінна ісьці па лініі перамаганьня рэштак кулацкага ўплыву ў калгасах, на лініі барацьбы з рэшткамі дробнаўласьніцкіх тэндэнцый паасобных груп калгаснікаў і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Аднак, ня ўсюды раённыя і мясцовыя арганізацыі па-бальшавіцку ацанілі задачы барацьбы за збожжа ў калгасным сэктары.

Выпікам агідных скрыўленьняў палітыкі партыі, слабой, а ў некаторых мясцох поўнай адсутнасьці масава-палітычнай работы, зьявіліся нездавальняючыя тэмпы здачы збожжа калгасным сэктарам. На 1 сьнежня агульнарэспубліканскі плян збожжазагатовак па калгасах выканан толькі на 67,4 процантаў.

Першай неабходнейшай умовай узмацненьня тэмпаў збожжазагатовак у калгасах зьяўляецца злучэньне работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў з выкананьнем заданьняў па здачы збожжа. У бліжэйшую-ж пяцідзеньку калгасы павінны выйсьці на перадавыя пазыцыі збожжазагатоўчага фронту. Партыя і рабочая класа, якія ажыцьцяўляюць кіраўніцтва сацыялістычнай перабудовай сельскай гаспадаркі, аказваюць вялізарную тэхнічную, фінансавую і іншую матар'яльную і арганізацыйную дапамогу калгаснаму сялянству, маюць права патрабаваць першачарговага выкананьня калгасамі іх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Неабходна таксама дабіцца карэннага пералому ў ходзе збожжазагатовак па **індывідуальным сэктары.** Дагэтуль у радзе раёнаў існуе яўная недаацэнка ролі аднаасобніка ў збожжазагатоўчай кампаніі, ігнараваньне масавай работы сярод бяднацка-сераднацкіх мас вакол выкананьня кантрактацыйных дагавароў і самаабавязацельстваў. Даволі паказаць на **Шклоўскі** раён, дзе індывідуальны сэктар выканаў заданьне па здачы збожжа толькі на 42,2 проц., у той час, як калгасы раёну здалі 152,3 проц. пляну. У радзе сельсаветаў Слуцкага, Рагачоўскага і інш. раёнаў зусім забыліся аб аднаасобніку, пакінулі збожжазагатоўкі ў індывідуальным сэктары на поўны самацёк.

Тэрмін спагнаньня **цьвёрдых заданьняў** з кулацка-заможных гаспадарак даўно прайшоў. Між тым у большасьці раёнаў гэта справа настаўлена зусім нездавальняюча. Побач з адкрытым праваапартуністычным патураньнем кулацтву ў радзе сельсаветаў, з прымірэнчымі адносінамі да кулацкага сабатажу збожжазагатовак, наглядаюцца агідныя «левыя» скрыўленьні палітыкі партыі, якія выяўляюцца ў давядзеньні цьвёрдых заданьняў да серадняцкіх і паваг бедняцкіх. Характэрным прыкладам можа служыць Заходзкі сельсавет Шклоўскага раёну, дзе цьвёрдыя заданьні складалі 75 проц. агульнага пляну здачы збожжа па сельсавеце.

Сьнежань — рашаючы месяц збожжазагатовак. Да 1-га студзеня 1932 г. гадавы плян загатовак павінен быць поўнасьцю выканан. Таму неабходна ў бліжэйшыя-ж дні забясьпечыць рашучы зрух у ходзе кампаніі **па ўсіх сэктарох.**

Усе магчымасьці для гэтага ёсьць. Трэба толькі ўзьняць шырокія масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на рашучую барацьбу за збожжа, узброіць кампанію сацыялістычнымі мэтадамі працы — сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам, узаемадапамогай калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў. **«Неабходна работу па ўзмацненьні тэмпаў загатовак правесьці такім чынам, каб саўгасы, калгасы і МТС зьяўляліся прыкладам для аднаасобнікаў сваёй датэрміновай здачай прадукцыі дзяржаве і былі сапраўднымі арганізатарамі ўсіх, памятаючы, што барацьба супроць спажывецкіх настрояў у калгасах за свячасовае і поўнае выкананьне імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай ёсьць барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгаснага будаўніцтва»** (з пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

МНОЖЦЕ ВОПЫТ ПЕРАДАВІКОЎ

ПАСКАРЭНЬНЕМ ПРАЦЭСАЎ АПРАЦОЎКІ, РАШУЧАЙ БАРАЦЬБОЙ З РВАЦКІМІ, КУЛАЦКІМІ НАСТРОЯМІ—ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК ТЭХКУЛЬТУР

Якасьць ільну—на першае месца

Агульны сход калгаснікаў калгасу «Случ», абгаварыўшы рапарт-адозву калгасу імя Чарвякова, абавязваецца таксама **датэрмінова скончыць перапрацоўку і здачу ільну дзяржаве.**

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, калгас «Случ» ужо атрымаў вынікі дасягненьні па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні.

Плян збожжазагатовак выкананы на 100 проц.

У падарунак зьезду жанчын-калгаснік здана дзяржаве звыш пляну 6,5 тон бульбы; плян зяблёва выканан на 100 проц.

Да 25 лістапада плян ільназагатовак выканан на 95 проц.

Барацьба за якасьць прадукцыі ў лён здан ня ніжэй як № 10.

Па даручэньні агульнага сходу праўленьне калгасу.

Простыя мялкі—на 2-х зьменную работу

ЛЕПЕЛЬ. 27. (Белта). Калгас «Х-ы зьезд саветаў БССР» свячасова ўключыўся ў месячнік апрацоўкі і здачы ільна-валакна дзяржаве. Апрацоўка ільну праводзіцца ў дзьве зьмены. Поўнасьцю выкарыстоўваюцца драўляныя ільнамялкі.

85 проц. ільна-трасты ўжо пераапрацавана, 7 цэнтн. валакна здана дзяржаве. У бліжэйшыя 2-3 дні калгас поўнасьцю скончыць апрацоўку ільну і выканае заданьне па здачы ільна-валакна.

Селькоры—на барацьбу за лён

ДУБРОЎНА, 28/XI. (БЕЛТА) 25-га лістапада ў г. Дуброўно адбыўся зьлёт селькораў ільнаводчых калгасаў. Селькоры ўключыліся ў правядзеньне ўдар нага месячніка па апрацоўцы і здачы ільнавалакна дзяржаве. Зьлёт выклікаў на сацпаборніцтва селькораў Талачынскага раёну.

Селькоры прызналі, што да гэтага часу яны невыстарчальна змагаліся за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і за свячасовае выкананьне пляну апрацоўкі і здачы ільнавалакна. Ухвалена наладзіць выпуск штодзенак, праводзіць сыстэматычныя рэйды селькораўскіх брыгад.

Зьлётам селькораў распрацован рад мерапрыемстваў па паладжаньні работы па суцільных, трапальных і мяльных пунктах і пераводзе працы на круглыя суткі.

Зьлёт выявіў, што ў большасьці калгасаў прыміяльна - прагрэсыўная зьдзельшчына ў апрацоўцы ільну ня ўведзена. Назасобныя праўленьні калгасаў супраціўляюцца ўвядзеньню гэтых мерапрыемстваў. Выяўлена таксама, што кіраўніцтва некаторых калгасаў праяўляе кулацка-рвацкія тэндэнцыі і лепшае валакно разьмяркоўваецца паміж калгаснікамі, замест першачарговай здачы дзяржаве.

Чырвоны сьпіс

кандыдатаў на прэміяваньне за датэрміновую апрацоўку і здачу тэхкультур дзяржаве

№№ п. п.	Назва калгасу	Назва раёну	Проц. выкананьня
10	Калгас імя Якаўлева	Лёзьнянскі	100 проц.
11	» імя Сталіна	»	100 »
12	» «Авангард»	»	100 »
13	» «Энергія»	»	100 »
14	» «Трэці рашаючы»	»	100 »
15	» імя Молатава	»	100 »
16	» «Пяцігодка»	»	100 »
17	» імя Калініна	»	100 »
18	» імя Чарвякова	»	100 »
19	» імя «518»	»	100 »
20	» «Праўда»	»	100 »
21	» «Чырвоны Ўдарнік».	»	100 »
22	» «Адказ інтэрэнтам».	»	100 »
23	» «Перадавік»	»	100 »
24	» «Ленінец»	»	100 »
25	» «Пабеда»	»	100 »

У палоне кулака

КАПЫЛЬ. Характэрным прыкладам апартуністычнага ігнараваньня ільназагатовак зьяўляецца практыка **Бабаўнянскага** сельсавету, па якім на 23 лістапада загатоўлена менш 1 проц. валакна.

Сельсавет і мясцовыя сельспажыўтаварыствы не вядуць растлумачальнай масавай работы сярод калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў, наадварот, —самі разважаюць аб «перэльнасьці пляну» і тым самым спрыяюць зрыву загатовак.

Давядзеньне пляну загатовак да аднаасобных гаспадарак зрываецца. **Кулацка-заможныя гаспадаркі вёскі Волосава атрымалі «цьвёрдыя» заданьні па... 4 кгр.**

Замест разгортваньня работы па хутчэйшым выкананьні пляну здачы добраякаснага ільну, у сельсавеце разгарнуліся спрэчкі па ясным пытаньні: прымаць, ці ня прымаць «усякі» лён?

Загатоўца **Мірскі** трымаецца такой думкі: «Патрэбна лён прымаць **усякі.** Калі не будзем прымаць, то ня выканаем пляну, а здатчыкі будуць здаваць у другім месцы».

Гэтыя факты гавораць аб тым, што бабаўнянскія загатоўцы, падтрыманыя сельсаветам, праводзяць **кулацкую лінію,** якая вядзе да зрыву загатовак.

Патрэбна неадкладна перагледзець цьвёрдыя заданьні кулацкім і заможным гаспадаркам.

Адначасова трэба перагледзець склад сельсавету і загатоўчага апарату, ачысьціўшы іх ад апартуністаў—агентаў кулака.

Я.

ПАСЕЎНУЮ 1932 ГОДУ СУСТРЭЦЬ У БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ

ДА 1-га СТУДЗЕНЯ СКОНЧЫЦЬ ЗАГАТОЎКІ ШМАТГАДОВЫХ ТРАЎ

Арганізаваць загатоўкі кармовых траў

Шпаркае разьвіцьцё буйных жывёлагадоўчых гаспадарак патрабуе стварэньня моцнай кармавой базы. Пасеўная плошча пад шматгадовымі травамі ў 1932 годзе павінна быць цалкам забясьпечана насеньнем. Таму загатоўкі кармавых траў зьяўляецца адказьнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй. Ва ўсёй сыстэме падрыхтоўчай работы да трэцяй бальшавіцкай вясны гэта кампанія павінна заняць адно з першарадных месц.

Паводле вызначаных тэрмінаў НКЗБ, загатоўкі насеньня павінны быць скончаны да 1 студзеня. Такім чынам, сьнежань зьяўляецца рашаючым у ходзе загатовак.

Аднак, трэба канстатаваць, што цяперашнія тэмпы не даюць гарантыі, што гэта работа будзе скончана ў тэрмін. Апошнія даныя паказваюць, што гаспадарча-палітычнае значэньне загатовак насеньня некаторымі раённымі арганізацыямі недаацэньваецца.

На 1 сьнежня загатоўлена нікі — 4,8 проц. да пляну, серадзелі — 1,84 проц., канюшыны — 0,45 проц., Цімафеёўкі — 33 проц., лугавых траў —15,2 проц., а па ўсіх травах плян выканан толькі на 4,3 проц.

Паданыя лічбы з усёй нагляднасьцю паказваюць на наяўнасьць у некаторых мясцох апартуністычнай стаўкі на самацёк, нежаданьне арганізаваць загатоўкі. У радзе раёнаў пляны загатовак яшчэ не разгледжаны і не даведзены да здатчыкаў. Вакол выкананьня кантрактацыйных дагавароў не праводзіцца належная масавая работа. Так, у Брагінскім раёне пляны яшчэ знаходзяцца ў раёне, у Сьмілавічах плян загатовак мацыуецца ў партфэлі дырэктара МТС ужо два месяцы. Ёсьць і такія раёны, як Старобінскі, дзе пляны загатовак далей канцылярый сельсаветаў ня спушчаны. Спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак праходзіць таксама недапушчальна марудна.

Такая бязьдзейнасьць некаторых раённых арганізацый праходзіць да таго, што дзе-ні-дзе кулак пачынае праводзіць сваю шкодную работу. Так, у калгасах Старобінскага раёну насеньнем канюшыны пачалі скармліваць жывёле.

Ня гледзячы на катэгарычныя пастановы дырэктыўных органаў, некаторыя мясцовы мелюць насенную віку на корм жывёле (Менск).

Усе гэтыя факты нельга інакш разглядаць, як шкодніцтва і простую дапамогу кулаку, які імкнецца сарваць падрыхтоўку да веснавой кампаніі.

Задача раённых арганізацый — узяцца па-баявому за разгортваньне загатовак, нанесьці руйнуючы ўдар па ўсякіх праявах апартуністычных адносін да гэтай важнейшай справы. Неадкладна давесьці пляны да здатчыкаў, арганізаваць ва ўсіх калгасах і саўгасах работу па абмалоце канюшыны, цімафеёўкі, нікі і г. д. Шырока разгарнуць масавую работу і мабілізаваць масы калгаснікаў і бяднацка-сераднацкія масы аднаасобнікаў на поўнае выкананьне пляну і кантрактацыйных дагавароў, вядучы самую рашучую барацьбу з рвацкімі тэндэнцыямі, разбазарваньнем і размолам насеньня.

Сьнежань месяц зьяўляецца рашаючым, на працягу якога плян загатовак павінен быць выканан поўнасьцю. Раённыя арганізацыі павінны памятаць, што насеньне у БССР сёлета ня будзе заводзіцца, і пасеўная плошча кармавых траў у 1932 годзе павінна быць цалкам забясьпечана за лік мясцовых загатовак.

Недаацэньваюць важнай задачы

БРАГІН.

Брагінскі раён мае жывёлагадоўчы напрамак. Здавалася-б, што раённыя арганізацыі павінны надаць асаблівую ўвагу загатоўкам і забясьпечыць пасеўную плошчу 1922 г. насеньнем кармовых траў. Між тым райкалгасаюз і райза недаацэньваюць гэтай важнейшай справы. Пляны загатовак насеньня яшчэ ня спушчаны да здатчыкаў. Ня вылучаны ўпаўнаважаныя раённай насенканторы, якія павінны кіраваць загатоўкамі Зусім адсутнічае апарат прыёмшчыкаў. Нават і калгасы не паінфармаваны аб тым, хто займаецца загатоўкамі насеньня.

Л.

Забараніць размол насеньня вікі на млынох Белсампрамсаюзу

МЕНСК.

Ня гледзячы на пастановы НКЗБ аб забароне размолу насеньня вікі, арцель «Чырвоны аўсянік» (Камароўка) ня лічыцца з пастановамі НКЗБ і меле віку, якая прывозіцца сялянамі. Тыдняў тры таму назад віку малолі бяз усякай прымешкі, а зараз мелюць пад выглядам мешаніны: віку мяшаюць з аўсом, жытам, ячменем.

Характэрна, што харчовы сэктар Белсампрамсаюзу ня ведае аб пастановах цэнтральных арганізацый і не даваў млынам, якія знаходзяцца ў яго распараджэньні, ніякіх указаньняў у гэтым пытаньні.

М.

Пляны загатовак захрасьлі ў палках сельсаветаў

СТАРОБІН.

Апрача пасылкі ў сельсаветы пляну загатовак насеньня шматгадовых траў, насенкантора і іншыя загатоўчыя арганізацыі больш нічым не займаліся. Пляны па сельсаветах ляжаць нікрапутымі. Да асобных населіч і калгасаў не даведзены. Толькі тры сельсаветы далі цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам, але таксама спыніліся на гэтым, не праверыўшы ходу выкананьня.

І ня дзіва, што па раёне па 25 лістапада загатоўлена: сэрадэллі толькі 14 цэнтн., вікі — 6,5 цэнтн. Забутавана кораньплёдаў на высадку ўсяго 16 проц. пляну.

Здавалася-б, што РВК, а ў прыватнасьці райземчастка павінны былі-б прыняць з свайго боку захады, каб сельсаветы распрацавалі пляны загатовак насеньня, дасланыя імі давялі іх да кожнага калгасу і населішча. Але калі 23 лістапада адбываўся пленум РВК і была прапанова абгаварыць пытаньне аб ходзе загатовак насеньня, гэта прапанова была адкінута.

З недаацэнкай загатовак насеньня кармавых траў трэба пакласьці канец. Старабінскі РВК павінен прыняць меры да тых сельсаветаў, якія злачынна марынуюць пляны ў сваіх канцылярыях і нічога ня робяць каб іх выканаць. Яравы клін 1932 году павінен быць забясьпечан насеньнем траў.

Свой.

Пляны загатовак насеньня

СМАЛЯВІЧЫ.

Раённы плян загатовак насеньня кармовых траў зацьмерджан яшчэ ў верасьні месяцы, але да здатчыкаў ён не даведзен. Здавалася-б, што МТС павінна праявіць асаблівую актыўнасьць у давядзеньні пляну да калгасаў. На самой справе мы маем адваротнае. Дырэктар МТС тав. Кананаў, атрымаўшы пляны загатовак па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, паклаў яго ў партфэль і трымае пры сабе да сёнешняга дня.

Цікава ведаць, колькі месяцаў плян загатовак будзе яшчэ марынавацца ў партфэлі дырэктара МТС.

Я.

Насенкай канюшынай кормяць жывёлу

МАГІЛЕЎ.

Стварэньне моцнай насеннай базы гароднины і кармавых траў у Магілеўскім раёне мае вялізарнае значэньне як раёну з садова-гародным і жывёлагадоўчым напрамкам.

Аднак, загатоўкі насеньня гароднины ў раёне праходзяць марудным тэмпамі. Насеньня гароднины загатоўлена 50 кгр. Ня лепш справа і з загатоўкай насеньня кармавых траў. Па пляне патрэбна загатовіць 2.268 цэнтн., загатоўлена ўсяго 80. Райнасенкантора і райспаб бязьдзейнічаюць і фактычна не зьяўляюцца кіраўнікамі загатоўчай кампаніі. У выніку слабога кіраўніцтва, Таранаўскі сельсавет да гэтага часу не даўў пляну загатовак насеньня да калгасаў і населішч.

Праўленьні паасобных калгасаў нанаплявацельску адносяцца да выкананьня дагавароў па кантрактацыі насеньня. Так, у калгасе «Сацыяліст» Княжыцкага сельсавету, 20 гэкт. канюшыны ляжыць неабмалочанай і скарыстоўваецца для корму жывёлы. Такія-ж факты назіраюцца і ў калгасах імя Леніна, Новасельскага сельсавету, «Шлях сацыялізму», Чырвонапольскага сельсавету.

Я. Ш.

ПАСКАРЭНЬНЕ ТАВАРАЗВАРОТУ—

ВУЗЛАВАЯ ЗАДАЧА САВЕЦКАГА ГАНДЛЮ

Падбор асартымэнту ў цэнтр увагі

БАБРУЙСК. (Наш. кар.).

Праведзеная бабруйскай РСІ праверка [illegible] і магазынаў каапэрацыйна-[illegible]лёвых арганізацый гораду выявіла [illegible]кія залежы тавараў.

Бабруйскае аддзяленьне Белгандлю [illegible]амаль трохмесячны запас папарос. [illegible]суму 4.500 руб. Работнікі складу [illegible]едаюць, калі і якім чынам будуць [illegible]ізавацца гэтыя матрацы. Кіраў[illegible]ва аддзяленьня Белгандлю бяз уся[illegible] па гэта пастаў затрымлівае рэ[illegible]цыю камэрцыйных тавараў, у вы[illegible]чаго стварыліся залежы тавараў [illegible]суму 25.000 руб.

[illegible]е-ж самае і па лініі Белкаапсаю[illegible] магазынах гатовай вопраткі Бел[illegible]саюзу зараз прысланы і ляжаць [illegible]4.000 руб. летніх шапак. Яшчэ [illegible] у райсаюзе. На яго базе ўжо два [illegible] ляжыць 1.500 сярпоў, год ля[illegible]ь вага для вызначэньня якасьці [illegible]жа і іншыя тавары. Таксама тры [illegible]цы на базе ляжыць па 4.000 руб. [illegible]лак і 30 вагонаў солі.

[illegible] крамах ЗРК камбінату ляжыць [illegible]т боцікаў, якія рэалізаваць над[illegible]ай марудна. Ніхто не падумаў аб [illegible], каб перакінуць гэтыя тавары па [illegible] вучастку, дзе яны хутчэй рэалі[illegible]ца. Апрача таго ў ЗРК камбінату [illegible]ыць 55 взораў, шмат розных люстэрак, няходкая галянтарэя, дарагія цацкі і іншыя падобнага роду тавары. Гэты-ж малюнак можна наглядаць у цэлым радзе крам Бабруйскага ЦРК.

Разам з тым, праверка выявіла разпабой у цэнах на тавары паміж каапэрацыйна-гандлёвымі арганізацыямі гораду.

Чым, як ня інэртнасьцю, можна вытлумачыць той факт, што, напрыклад, на базе райспажыўсаюзу тавар пасьля ўжо разьмеркаваньня доўгі час ляжыць бяз руху. Сельспажыўтаварыствы чакаюць паведамленьня ад райсаюзу, а апошні, разьмеркаваўшы фармальна тавары, не клапоціцца аб іх хутчэйшым прасоўваньні да спажыўца.

Сярод раду прычын замарожваньня таваразвароту пэўнае месца займае абстрактны падыход да разьмеркаваньня тавараў. Можна прывесьці не адзін факт, калі сельспажыўтаварыству навязваюць непатрэбны яму асартымэнт тавараў.

Падбор асартымэнту—гэта не апошняя задача.

«Асартымэнт у рабоце кіруючых гандлёвых органаў павінен заняць вялікае месца. Ад яго залежыць задаваленьне істотных патрабаваньняў спажыўца». (Гей, з даклада на сходзе менскага партактыву).

Магазыны закрыты, а тавары замарожаны

Згодна пастановы камітэту цэн пры СНА, зацьверджанай кастрычніцкім пленумам ЦК УсеКП(б), цэны на камэрцыйныя тавары, павінны быць зьніжаны ў сярэднім на 30 проц. Апрача гэтага гандаль па камэрцыйных цэнах павінен быць абмежаваны спэцыяльнай сеткай дзяржамагазынаў.

Выходзячы з гэтай дырэктывы, каапэрацыйныя арганізацыі абавязаны былі ў самы кароткі тэрмін перадаць усе тавары па камэрцыйных цэнах Белдзяржгандлю.

Пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) **полацкія** каапэратары зразумелі пасвойму. Па распараджэньні праўленьня ўсе камэрцыйныя магазыны ЦРК закрыты, а тавары замарожаны. Атрымалася так, што на працягу 20 дзён на некалькі дзесяткаў тысяч рублёў тавараў ляжала бяз руху. Замест таго, каб паклапаціцца аб перадачы гэтых тавараў Белгандлю, работнікі полацкага ЦРК пачалі ўсімі мерамі дабівацца дазволу гандляваць па камэрцыйных цэнах.

Ан. Ш.



БУДАЎНІЦТВА ДСМУ ЎРАДУ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ВЫШЭЙ АРГАНІЗАТАРСКУЮ і КІРУЮЧУЮ РОЛЮ

НІЗАВЫХ ПАРТЗЬВЕНЬНЯЎ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

ВЕСЬЦІ НЕПРЫМІРЫМАЕ ЗМАГАНЬНЕ СУПРОЦЬ УСЯЛЯКІХ СПРОБ ВЫПУСТОШВАНЬНЯ ПАЛІТЫЧНАЙ СУТНАСЬЦІ ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ, СУПРОЦЬ ДЗЯЛЯЦКАГА ПАДЫХОДУ ДА АЦЭНКІ РАБОТЫ ЯЧЭЕК

Раўняцца па перадавых

Новыя ўмовы і задачы абавязваюць вытворчыя партарганізацыі ператварыць перавыбарчую кампанію парторганаў у баявую мабілізацыю камуністаў і лыркіх час беспартыйных рабочых на далейшую барацьбу за вытвор[illegible]ерамогі, больш узмоцненую барацьбу па выкарчоўваньні апартуністычнай практыкі, якая зьяўляецца асноўнай перашкодай у справе пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

«Наша праграма рэальная. Няма і ня можа быць ніякіх аб'ектыўных прычын для спраўданьня прарываў. Посьпехі перадавых фабрык і заводаў, якія датэрмінова выканалі сваю пяцігодку,—яркі довад абсалютнай рэальнасьці плянаў» (з дырэктыўнага ліста ЦК КП(б)Б). У паняўнасьці ўсе неабходныя ўмовы для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну кожным прадпрыемствам. Трэба толькі па-сапраўднаму ўзначаліць актыўнасьць і творчы энтузіязм працоўных мас, трэба ўмець па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць.

Бліскучыя ўзоры вытворчай работы паказала партарганізацыя менскай гарбарні «Бальшавік». Там у сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўцягнуты ўсе камуністы і камсамольцы і амаль на 100 проц. беспартыйныя рабочыя, прычым 93,9 проц. камуністаў і больш [illegible] беспартыйных рабочых сыстэматычна ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ свае вытворчыя заданьні.

Пераводам усёй работы па рэйкі саспаборніцтва і ўдарніцтва, рэалізацыі 6 сталінскіх умоў, партарганізацыя заводу забясьпечыла сыстэматычнае перавыкананьне прамфінпляну па ўзьнасных і якасных паказальніках.

Вопыт і мэтады работы гэтай партарганізацыі павінны стаць здабытнам кожнай вытворчай ячэйкі КП(б)Б. Асноўным абавязкам ячэек і партарганізацый прадпрыемстваў, якія адстаюць у выкананьні прамфінпляну, зьяўляецца — забясьпечыць у часе перавыбарчай кампаніі карэнны пералом у іх рабоце. Дасягнуць гэтага магчыма пры ўмовах шырокай самаправерачнай работы, глыбокага аналізу прычын, якія тармозяць выкананьне прамфінпляну, сапраўднай перабудовы работы, перавёсны цэнтр цяжару яе ў нізавыя вытворчыя зьвеньні.

Гэтага палажэньня, відавочна, не разумеюць паасобныя парт'ячэйкі, не спраўляюцца з пастаўленымі перад імі задачамі ў правядзеньні перавыбарчай кампаніі. Адным з прыкладаў недапушчальна фармальных адносін да правядзеньня гэтай важнейшай палітычнай задачы зьяўляецца парт'ячэйка Шклоўскай фабрыкі «Спартак». Самаправерачная работа ў гэтай ячэйцы праведзена бяз удзелу мас і зьведзена выключна да рэвізіі ячэйковых спраў. Ня трэба ніякіх камэнтараў, каб даказаць нікчэмнасьць гэтага «рэвізорства».

Работа кожнай ячэйкі павінна ацэньвацца не па колькасьці пасяджэньняў і напісаных пастаноў, а па канкрэтных вытворчых паказальніках, па канкрэтнай рабоце ў выкананьні прамфінпляну, па тэй барацьбе, якую ячэйка вядзе з правым і левым апартуністамі і прыміраўцтвам да яго.

Пытаньні перабудовы работы, рэалізацыі шасьці сталінскіх умоў, —гэта зьяўляецца асновай пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, павінны быць цэнтральнымі ва ўсёй рабоце па правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

Забясьпечылі павялічэньне прадукцыйнасьці працы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў нізавых зьвеньняў пераварылася ў масавую праверку работы ячэек. Нізавыя партзьвеньні праводзяць вялікую работу па мабілізацыі рабочых мас на поўную рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна. На лесазаводзе «Сацыялізм» за час справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў прамфінплян выконваецца на 107 проц. На фабрыцы «Праца», кожная зьмена выпускае 1.300 пар абутку.

Разам з гэтым палепшылася якасьць прадукцыі: замест ранейшых 85% першага гатунку, фабрыка дае 90%. На фабрыцы «Камінтэрн» на гаспадарчы разрахунак пераведзена 5 брыгад. На хлебазаводзе прадукцыйнасьць працы за апошні пэрыяд павышана на 7%.

Гэтыя ўсе факты — паказальнікі вялікага ўздыму актыўнасьці рабочых мас.

Разам з гэтымі станоўчымі прыкладамі баявой работы па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі выяўлен рад момантаў неразуменьня таго вялікага палітычнага значэньня, якое маюць перавыбары. Рад кіраўнікоў нізавых партыйных зьвеньняў не ўсьвядомілі таго, што справаздачна-перавыбарчая кампанія — баявая мабілізацыя мас на пасьпяховае завяршэньне трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Бюро партыйнага камітэту дэпо яўна ігнаруе дырэктывы ЦК КП(б)Б аб агляднае партработы. Там нават не арганізаваны самаправерачныя брыгады.

У часе перавыбараў бюро цэхавай ячэйкі (цэх абточкі) яўна парушаны прынцыпы ўнутры-партыйнай дэмакратыі. Агульны сход на выбраў у новы склад бюро былога сакратара. Бюро партыйнага камітэту для таго, каб пакінуць яго ў кіруючым складзе, праводзіць сход у другі раз, дабіваецца павялічэньня складу бюро з 5 да 7 чалавек з тым, каб абавязкова пакінуць у кіруючым органе б. сакратара ячэйкі.

Зусім дрэнна разгортваецца падрыхтоўка да перавыбараў парторганаў на заводзе імя Лапушкага. Сакратар ячэйкі зборачнага цэху Драйчук ня ўжыў ніякіх мер для правядзеньня агляду партработы. Групарторгі не рабілі справаздач аб сваёй рабоце. Некаторыя з іх нават ня ведаюць аб тым, што яны зьяўляюцца партарганізатарамі. Бюро парткому, не чакаючы перавыбараў, распусьціла бюро ячэйкі зборачнага цэху і ўсім яго членам вынесла партыйнае спагнаньне.

Урокі гэтых дзьвёх ячэек павінна ўлічыць уся гомельская партарганізацыя. Траба бязьлітасна ўдарыць па апартуністах, на парушальніках упутрыпартыйнай дэмакратыі, па ўсіх тых, хто змазвае палітычнае значэньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Б. Зэльманаў.

Змаганьнем за ажыцьцяўленьне сталінскіх умоў—множым вытворчыя посьпехі

У пастанове ЦК УсеКП(б) ад 15 сакавіка г. г. падкрэсьлена, што «камуніст, які ня прымае актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдар ніцтве і не зьяўляецца прыкладным на вытворчасьці, не апраўдвае годнасьці бальшавіка, члена ленінскай партыі». Ад камуніста на вытворчасьці патрабуецца актыўны ўдзел у сацыялістычных формах працы, яго авангардная роля сярод беспартыйных рабочых, бальшавіцкая настойлівасьць і дысцыплінаванасьць у справе выкананьня баявых задач партыі.

Падатульваючы вынікі работы партарганізацыі менскай гарбарні «Бальшавік» з часу мінулых перавыбараў парторганаў (ліпень 1931 г.) трэба ад значыць, што з гэтай задачай партарганізацыя заводу блісчуча справілася.

Рэзультат выкананьня вытворчай праграмы за трэці квартал і кастрычнік месяц паказваюць, што камуністы ў сапраўднасьці знаходзяцца на чале барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па колькасных, і якасных паказальніках. Зараз усе камуністы заводу поўнасьцю ахоплены саспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Большая частка партыйцаў сыстэматычна перавыконвае свае вытворчыя заданьні. Калі да часу мінулых перавыбараў парторганаў перавыконвалі вытворчыя заданьні 49,8 проц. усіх беспартыйных рабочых і 72,5 проц. камуністаў, то на 1 лістапада ўжо 75,1 проц. беспартыйных рабочых і 93,9 проц. камуністаў перавыконваюць заданьні.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што камуністы ня толькі зьяўляюцца перадавымі па выкананьні прамфінпляну, але і вядуць за сабой у гэтай справе беспартыйных рабочых. Парткалектыў сваёй штодзённай работай забясьпечвае ажыцьцяўленьне ўказаньняў партыі аб тым, што «перадавая кіруючая роля партыйца на прадпрыемстве павінна заключацца, галоўным чынам, у тым, каб кожны камуніст стаў прыкладным на вытворчасьці».

Значна павысілася роля за гэты пэрыяд і камсамольскай арганізацыі заводу. Калі на 1 лістапада з усяго калектыву камсамолу толькі 62,3 проц. перавыконвалі свае заданьні па прамфінпляне, то зараз гэта лічба даведзена да 81,6 проц. У першым хрэсным пэху 87,2 проц. камсамольцаў перавыконваюць свае вытворчыя заданьні. Ударніцтвам ахоплена 98 проц. усіх камсамольцаў.

Павышэньнем перадавой ролі на вытворчасьці камуністаў, барацьбой за рэалізацыю 6 сталінскіх умоў, парткалектыў заводу забясьпечыў пасьпяховае выкананьне прамфінпляну з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал. Прамфінплян заводу за трэці квартал выкананы на 104,54 проц. у колькасным і на 110,8 проц. у цэнкасным вызначэньні, за кастрычнік месяц — на 106,98 проц. у колькасным і на 122,28 проц.—у цэнкасным азначэньні.

Побач з перавыкананьнем прамфінпляну па колькасных паказальніках, значныя посьпехі набыты ў справе барацьбы за якасьць. Другі хромавы цэх павялічыў звыш пляну гатунковасьць за трэці квартал на 0,77 проц. а першы хромавы цэх — на 4,18 проц. па чорным апойку і на 4,1 проц. па каляровым апойку. На выпрацоўцы вырастку павышана гатунковасьць па 10,39 проц., замест 5,5 проц. пляновых. Па аўчыне каляровай дасягнута павышэньне гатунковасьці на 6,96 проц. і аўчыне чорнай — на 11,13 проц., замест пляновых 4,5 проц. Па выпрацоўцы сьвіных скур на пляне прадугледжвалася магчымасьць адхіленьня ў бок паніжэньня гатунковасьці на 10 проц. Аднак, гэтага зьніжэньня ня толькі не дапушчана, а дана павышэньне гатунковасьці на 2,48 проц.

Посьпехі выкананьня паказальнікаў адхіленьня ад гатунковасьці забясьпечылі магчымасьць перавыканаць плян зьніжэньня сабекошту за трэці квартал з 5,89 проц. пляновых да 14,13 проц., а ў кастрычніку — да 27,36 проц. (без клеевярнага цэху).

Гэтым самым «Бальшавік» даў у фонд сацыялістычнага будаўніцтва звыш пляну 95.991 рубель за адзін толькі трэці квартал і каля 50.000 рублёў — за кастрычнік месяц.

Адзначаныя вытворчыя посьпехі ёсьць рэзультат бальшавіцкай работы парткалектыву гарбарні, настойлівай барацьбы за поўную рэалізацыю 6-ці сталінскіх умоў.

Зараз на заводзе ўжо ёсьць 19 гаспадарча-разрахункових брыгад з ахопам 235 ударнікаў. 6 брыгад гэтымі днямі падалі заявы аб пераводзе іх на гаспадарчы разрахунак. У 29 брыгадах правядзіцца зьменна-суточнае пляніраваньне, што стымулюе павышэньне прадукцыйнасьці працы.

На заводзе перагледжана заработная плата 10 вядучых прафэсій. Раней разьбіўшчык 7-га разраду, выконваючы сваё заданьне на 116 проц., зарабляў у сярэднім у дзень 4 р. 97 к. Зараз, пасьля перагляду тарыфнай сеткі, ён выконвае заданьне на 147 і атрымлівае ў дзень 6 р. 28 к. Аналёгічнае ўзьнясьце прадукцыйнасьці працы ёсьць і па разэе іншых прафэсій. На прагрэсіўна-прэміяльную аплату працы пераведзена 10 брыгад.

У рэзультаце барацьбы за ліквідацыю абязьлічкі, ураўнілаўкі ў зарплаце, барацьбы за паляпшэньне матар'яльных і культурных умоў у рабоце дасягнута значнае зьмяншэньне цякучасьці рабочай сілы. Калі цякучасьць рабочай сілы у другім квартале складала 12,7 проц., дык у трэцім квартале яна зьніжана да 5,4 проц. і ў кастрычніку да 3,38 проц.

Партыйная арганізацыя гарбарні «Бальшавік» ня спыніцца на дасягнутых посьпехах. Яна будзе ягчэ з большай энэргіяй змагацца за новыя вытворчыя перамогі, заваёўваючы сабе месца ў перадавых радох барацьбітоў за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Шамэс І., Мінкін З.

Павысіць ролю друку ў барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б адзначае недавацэнку асобнымі раённымі газэтамі БССР, ня гледзячы на неадназарозыя адпаведныя ўказаньні ЦК КП(б)Б, пытаньняў барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, неабходнасьці непрымірымай і пасьлядоўнай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам і з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх іншых колераў, з нацыянал-апартунізмам, няўхільнага ажыцьцяўленьня беларусізацыі і далейшага разгортваньня работы сярод працоўных нацменшасьцяй.

2. ЦК КП(б)Б адзначае задавальнае сыгналізацыю газэты «ЗЬВЯЗДА» аб буйных палітычных памылках газэты «Сац. Шлях» і «Камунар» (агляд Друку ў «Зьвязьдзе» ад 20-га лістапада). За ў «Зьвязьдзе» ад 20-га лістапада). За праяўленую рэдакцыяй крычаўскай раённай газэты «Сацыялістычны шлях» апартуністычную недавацэнку неабходнасьці сыстэматычнай і пасьлядоўнай барацьбы за нацыянальную палітыку партыі (адсутнасьць у газэце барацьбы з канкрэтнымі праяўленьнямі ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму —галоўнай небясьпекі, з шавінізмам іншых колераў), за поўнае замоўчваньне місячніка генэральнай праверкі беларусізацыі і за адсутнасьць работы па пытаньнях абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяй Т. СЕМЯНКОВА ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ РЭДАКТАРА ГАЗЭТЫ І АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ. Накіраваць для адказнай работы ў крычаўскую раённую газэту тав. Дамарацкага, адкліканы яго з газэты «Чырвоная зьмена».

3. За палажэньнем кампанейскіх палыхкадзм неабходнасьці пагымбленьня і сыстэматычна ставіць пытаньне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і за недапушчальнае возьбленьне за апошнія 5 месяцаў барацьбы з прыхаваннямі вялікадзяржаўнага шавінізму і шавінізмаў усіх іншых колераў АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ РЭДАКТАРУ РАГАЧОЎСКАЙ ГАЗЭТЫ ТАВ. ПАРОШЫНУ.

4. Зьвярнуць увагу Крычаўскага і Рагачоўскага РК КП(б)Б на неабходнасьць забясьпечэньня з іх боку пастаяннага палітычнага кіраўніцтва раённымі газэтамі.

5. Прыняць да ведама палажэньне Культпропу ЦК аб правядзеньні брыгадамі сэктару друку зьезду 24 гарадзкіх і раённых газэт па пытаньні барацьбы за нацыянальную палітыку партыі. Абагуленыя вынікі агляду заслухаць на сакратарыяце ЦК.

6. ЦК абавязвае ўвесь друк БССР значна больш і глыбей разгарнуць работу па барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі, выкрываючы і даючы адпаведную палітычную ацэнку канкрэтным праяўленьням адхіленьняў ад нацыянальнай палітыкі партыі бальшэвізма змагаючыся з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з нацыянал-апартунізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх іншых колераў, з прыхаваннямі да іх, забясьпечыўшы пасьлядоўную і шырока - разгорнутую сыстэматычную работу па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Да ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту

ЧЭРВЕНЬШЧЫНА ПАВІННА РАПАРТАВАЦЬ ЗЬЛЁТУ

што зроблена, каб ліквідаваць апартуністычную практыку і мабілізацыі сродкаў

На рубяжы трэцяга рашаючага і чацьвертага—апошняга году пяцігодкі—задача ўпартай бальшавіцкай барацьбы за выкананьне фінпляну, у мэтах правядзеньня моцнай фінансавай базы пад шыркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца асабліва адказнай.

Многія раёны дабіліся вялікіх посьпехаў у выкананьні фінпляну. Значэньне мабілізацыі сродкаў зусім ня ўсьвядомлена арганізацыямі Чэрвеньскага раёну. З кварталу ў квартал наглядаецца зьніжэньне крывой выкананьня фінпляну. Апошнія даныя гавораць аб выкананьні толькі 32,4 проц. квартальнага заданьня.

Як паказала праверка, зробленая на месцы, мабілізацыя сродкаў была ўвесь час па-за ўвагай мясцовых арганізацый і праходзіла самацёкам. Апартуністычная практыка асабліва моцна давала сябе адчуваць на гэтым вучастку работы.

Райфа, які павінен быў быць кіруючым штабам выкананьня фінпляну, фактычна гэтай працай не кіраваў і нават не займаўся.

Кіруючыя арганізацыі раёну фармальна адносіліся да мабілізацыі сродкаў, усклаўшы ўсю адказнасьць на фінансавыя органы, і не правяралі, як зьбіраюцца абавязковыя і добраахвотныя плацяжы.

Старшыня райвыканкому т. Баранчык часта заяўляў, што «фінансы—гэта справа выключна райфа, а мы зараз займаемся больш важным пытаньнем—будуем шашу».

Інспэктар райфа Андруховіч лічыць, што «фінансы паогул страцілі свае значэньне». Гэта «лявацкая» тэорыя самым алмоўным чынам адбілася на ўсёй рабоце райфа.

Райбанк да апошняга часу зьяўляўся бюракратычнай установай, якая тармозіла пасьпяховае выкананьне фінпляну. Кіраўнік банку Федзеневу аддаў загад, каб пасьля 2-х гадзін зачыніць касу банку і ня прымаць ніякіх грошай. Старшыні сельсаветаў і пазсобныя сяляне, якія спазьніліся на 5,10 мінут, не маглі здаць часта даволі значных сум і прымушаны былі зварачацца з грашыма да хаты.

Атрымліваючы ад сельсаветаў рэестры па абавязковых плацяжох, банк, замест таго, каб неадкладна зьвярнуць іх сельсаветам, трымаў іх 2 месяцы, чым дапамагаў кулацкай агітацыі аб растраце сельсаветамі грошай.

Райком камсамолу пастанавіў паслаць у банк 5 лепшых камсамольцаў, якія-б змаглі выкарчаваць бюракратызм, але кіраўнік банку Федзеневу дабіўся таго, каб камсамольцы на работу прыняты ня былі. Паўстае пытаньне: дзе былі райкомы і райКК КП(б)Б?

Дрэнна працуюць нізавыя апчадкасы раёну. Касы ёсьць толькі ў 4-х сельсаветах з 12. Загадчык Равіцкай апчадкасы Сушкевіч часта адмаўляе селянам у выдачы ўкладаў, заяўляючы: «раз унесьлі грошы, трэба іх трымаць». Зусім зразумела, як спрыяюць такія галавацянскія заявы развіцьцю ашчадсправы ў раёне.

Дагэтуль раённыя арганізацыі не зрабілі належнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі. У выніку з кулакоў спагнана ня больш паловы с.-г. падатку і страхоўкі.

Фінансавая работа ў раёне не перабудавана на аснове масавых мэтадаў. Праведзеная нарада штабу фінэстафэты, сумесна з гарадзкім актывам, паказала, што фінансавая эстафэта ня толькі ня была скарыстана для мабілізацыі мас, але нават усім не папулярызавана ў раёне. Райфа, атрымаўшы адпаведную дырэктыву, абмежаваўся пасылкай у сельсаветы адносіны, у якой ніша, што «на месцах адбудзецца фінэстафэта, а пакуль штурмуйце адсталыя вучасткі самі». Нарада выявіла, што рад раённых арганізацый нічога ня робяць у галіне мабілізацыі сродкаў.

Старшыня райкалгасаюзу тав. Бохан, які павінен быў рабіць інфармацыю аб выкананьні фінпляну на калгасгосстоме, адмовіўся выступіць. Старшыня гарадзкога спажывецкага таварыства т. Шэршань заявіў, што ў яго сёе-тое робіцца. А калі яго спыталіся, як разгортваецца савецкі гандаль, ён адказаў, што гэтай справы ён быццам не разумее.

Нездавальняюча працуе райсаюз. Сельсаветы адчуваюць простую патрэбу ў каламазі, а на складзе базы райсаюзу ня ляжыць некалькі бочак. У краме, у Вайнізавіцкім сельсавеце шмат часу ляжаць сотні бутэлек ад гарэлкі.

Раённая камісія садзейнасьці існуе па паперы, прычым старшыня камісіі тав. Баранчык зьяўляецца «таварышам» старшынёй і ў рабоце ня прымае ўдзелу.

Аб апартуністычных настроях некаторых раённых работнікаў сьведчаць іх выступленьні на нарадзе: т. т. Судзік і Кяхайчык імкнуліся даказаць, што фінплян вельмі напружан і «нерэальны». Слабасьць арганізацыйна-масавай работы, наўменьше па-новаму кіраваць і па-новаму працаваць, апартуністы хацелі схаваць за шырмай «нерэальнасьці» пляну.

Чэрвеньскі раён «узнагародзіў» рагожным сьцягам. Трэба адзначыць, што падпясеньне рагожнага сьцягу ў ўзварушыла раённыя арганізацыі. Кіруючыя работнікі РВК—т.т. Баранчык, Шамецька—лічылі, што раз[illegible]ны сьцяг ім дан[illegible] памылкова, [illegible] «ўласна, моў, кажучы, прычым [illegible] райвыканком, пяхай за гэта адказ[illegible] райфа». Калі пачастала пытаньне [illegible] месцы знаходжаньні рагожнага сьцягу, перададзенага раёну на нарадзе актыву, дык старшыня райвыканкому Баранчык патрабаваў, каб сьцяг быў пастаўлен у райфа, бо «ён гэтага заслужыў». Калі-ж старшыня МК фінансава-банкаўскіх работнікаў павесіў сьцяг у РВК, дык ён (сьцяг) зьнік; аказваецца, што яго зачынілі ў шафу.

У апошнія дні вызначыўся некаторы зрух. У сувязі з прыездам брыгады НКФ, бюро РК КП(б)Б пастанавіла прыцягнуць да партыйнай адказнасьці кіруючых фінансавых работнікаў раёну і распусьціць раённую камісію садзейнасьці. Намечан рад мер для паляпшэньня фінансавай работы.

Чэрвеньшчына павінна дабіцца рашаючага пералому ў выкананьні фінпляну і ўдарнай работай даказаць, што яна заслужыла, каб з раёну ўбралі рагожны сьцяг.

5 сьнежня адкрываецца ўсебеларускі зьезд ударнікаў фінансавага фронту. Чэрвеньскі раён на гэтым зьездзе павінен рапуча сказаць, што зроблена ім, каб выйсьці з тылу ў перадавыя рады барацьбітоў за мабілізацыю сродкаў, каб канчаткова ліквідаваць апартуністычную практыку ў выкананьні фінпляну.

Б. СПАРЫХІН.

Масавая работа не разгорнута

БЯЛЫНІЧЫ. Большасьць калгасаў Бялыніцкага раёну дагэтуль ня ўключыліся ў месячнік перапрацоўкі і заготовак ільну, абвешчаны ЦК КП(б)Б.

Масавая работа не разгорнута.

Гэта зьяўляецца адным з прычын таго, што ільназагатоўкі ідуць вузкім дрэнна. Некаторыя сельсаветы, як Бялынічскі, Ільнянскі, Ніжнядзенскі, Ніжнядзенскі, Ніжнядзен

ШКОЛЫ САУГАСВУЧУ—НА РЭЙКІ ПАЛІТЭХНІЗМУ

ЗМАГАЦЦА ЗА МЭТАД ДЫЯЛЕКТЫЧНАГА МАТЭРЫЯЛІЗМУ У НАВУЧАНЬНІ, ВЫКРЫВАЦЬ ПРАВУЮ І ЛЯВАЦКУЮ ПРАКТЫКУ У ШКОЛЬНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

Разьбіць „лявацкія" ўстаноўкі

Сыстэма школ саўгасвучу заклікана вырашыць задачу падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для саўгасна-калгаснага сэктару сельскай гаспадаркі. Школы павінны падрыхтоўваць спэцыялістаў па сьвінагадоўлі, паляводзтву, жывёлагадоўлі, пчалярстве, гародніцтве і г. д. Школы саўгасвучу поўнасьцю знаходзяцца ў веданьні адзелаў кадраў галінных саўгастрэстаў, якія цалкам нясуць адказнасьць за пасьпяховае праведзеньне навучальнага году, за распрацоўку навучальных праграм, забесьпячэньне мэтадычнага кіраўніцтва і інш.

Трэсты нясуць поўную адказнасьць за арганізацыю матар'яльнай базы для разьвіцьця школ саўгасвучу, за вытворчай практыкі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе вызначае канкрэтныя шляхі для перабудовы навучаньня ў савецкай школе. Перабудова навучаньня і ўсяе сыстэмы работы адносіцца ня толькі да школ Наркамасьветы, але і да спэцыялізаваных школ, у даным выпадку і да школ саўгасвучу. Іменна гэтага не зразумелі работнікі аддзелаў кадраў саўгастрэстаў.

Чым можна вытлумачыць тое, што ў школах няма ніякай плянавасьці, сыстэмы ў рабоце, што адсутнічаюць навучальныя праграмы, што не распрацавана мэтодыка работы і выкладаньня, і ганебна скажаюцца прынцыпы вытворчай практыкі?

Перш за ўсё тым, што трэсты яўна недаацэньваюць значэньня школ саўгасвучу ў справе вырашэньня праблемы кадраў. Па-другое, наўпасьць у аддзелах кадраў трэстаў «левакоў», якія, скажаючы прынцыпы камуністычнага выхаваньня, настойліва трымаюць курс на пераўтварэньне школы ў цэх саўгасу і гэтым імкнуцца ператварыць школу ў вытворчасьці.

«Левакі», бяручы стаўку на адміраньне школы, імкнуцца зьнізіць у навучаньні ўдзельную вагу агульнаадукацыйных дысцыплін, пазбавіць вучняў магчымасьці атрымаць агульную адукацыю.

Матар'ялы паказваюць, што ў сыстэме саўгасвучаў настойліва ажыцьцяўляецца «лявацкая» практыка, што «левакі» прывялі паасобныя школы амаль да поўнага разбурэньня. Гэта бліскуча пацьвярджаецца фантамі аб няправільным і недапушчальным скарыстаньні вучняў у часе вытворчай практыкі, і тым, што да гэтага часу ў распараджэньнях і загадах трэстаў знаходзіць месца ўстаноўка — «школа — цэх саўгасу».

Змагаючыся з гэтымі «лявацкімі» скажэньнямі палітыкі партыі ў школьным пытаньні, трэба з усёй настойлівасьцю выкрываць і біць па тэорыях і практыцы правых — галоўнай небясьпецы, — якія накіраваны на адмаўленьне палітэхнізацыі.

Мы лічым, што «левакі» з Белсельтрэсту, якія вядуць жыцьцёвую і патрэбную школу саўгасвучу да разбурэньня, павінны быць прыцягнуты да самай жорсткай адказнасьці, што кіраўніцтва аддзелаў кадраў павінна быць безадкладна ўзмоцнена вытрыманымі педагогамі-марксыстамі.

Мы завастраем увагу трэстаў і Наркамасьветы на неабходнасьць тэрміновага перагляду навучальных праграм для школ саўгасвучу, павялічэньня вучэбных гадзін па агульна-адукацыйных дысцыплінах і настойлівага правядзеньня.

Вытворчая практыка павінна быць пабудавана так, каб яна садзейнічала выкананьню задачы аб падрыхтоўцы кваліфікаванага спэцыяліста, замацоўвала атрыманыя вучнямі веды і давала неабходную спэцыяльную практыку.

Без вырашэньня гэтае задачы, школы саўгасвучу ня здолеюць падрыхтаваць патрэбных кадраў кваліфікаваных рабочых.

Каго рыхтуюць саўгасвучы?

Жыліцкая школа саўгасвучу ўжо існуе пекалькі год. Школа непасрэдна падпарадкавана Белсельтрэсту. Школа павінна падрыхтоўваць кадры кваліфікаваных рабочых для саўгасна-калгаснага сэктару сельскай гаспадаркі.

Зараз калгасы і саўгасы, як ніколі, адчуваюць вострую патрэбу ў гэтых кадрах: не хапае кваліфікаваных сьвіноводаў, жывёлаводаў, работнікаў па садоўніцтве, пчалярстве і г. д.

Мы вымушаны канстатаваць, што Жыліцкая школа ні ў якім разе не дае патрэбнай кваліфікацыі вучням, не падрыхтоўвае іх для самастойнай, адказнай работы ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Прычыны такога становішча хаваюцца порш за ўсё ў тэй сыстэме кіраўніцтва, якая існуе да апошняга часу. Справа ў тым, што Белсельтрэст па працягу ўсіх год існаваньня школы, ні аднаго разу нават не зрабіў сур'ёзнай спробы распрацаваць вытворчыя пляны, навучальныя праграмы, забясьпечыць мэтадычным кіраўніцтвам школу.

Усе мінулыя гады школа працавала без усякага пляну і без усякіх навучальных праграм. У рэзультаце гэтага, якасьць навучаньня зусім нізкая.

Ня гледзячы на неадпаразовыя патрабаваньні вучнёўства і грамадзкасьці сельсавету даць школе кваліфікаваных работнікаў, якія здольны ажыцьдяўляць генэральную лінію партыі на адным з адказных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва — па падрыхтоўцы кадраў — па чале кіраўніцтва школы па працягу трох год заставаўся Курганскі, які заціскаў самакрытыку і фактычна зрываў усю работу школы. Сыгналы друку па гэтым пытаньні засталіся непачутымі работнікамі Белсельтрэсту.

Аб тым, як Белсельтрэст адносіцца да сваёй школьнай сыстэмы сьведчыць хоць-бы той факт, што на працягу чатырох месяцаў(!) аддзел кадраў і бухгальтэрыя разглядалі каштарыс школы. Школа была пазбаўлена магчымасьці атрымаць сродкі, пабыць абсталяваньне і падручнікі.

У пачатку гэтага навучальнага году Белсельтрэстам дасланы навучальныя праграмы, якія не адпавядаюць сучасным патрабаваньням, не адпавядаюць апошнім установкам партыі аб савецкай пачатковай і сярэдняй школе. У праграмах зусім няпазначане месца адведзена агульна-адукацыйным дысцыплінам. Праграмы наогул зьяўляюцца далёка недакладнымі і маюць рад палітычных памылак.

У сувязі з тым, што школа не дае патрэбнай агульнай адукацыі, няма магчымасьці даць вучням грунтоўныя веды па спэцыяльных дысцыплінах. Без дакладнага вывучэньня фізыкі і іншых навук немагчыма падрыхтаваць кваліфікаванага садавода, пчаляра, гародніка і г. д.

Адным з найбольш балючых пытаньняў у сыстэме школ саўгасвучу зьяўляецца вытворчая практыка вучняў. Па гэтым пытаньні няма ня толькі распрацаваных плянаў і праграм, але і паказаньняў з боку аддзелу кадраў. Вучні школ выкарыстоўваюцца ў саўгасах, як звычайныя рабочыя. Есьць рад выпадкаў, калі вучні пасьля сканчэньня школы зварачаюцца ў саўгас звычайнымі рабочымі.

Аддзел кадраў Белсельтрэсту ў пытаньні школьнага будаўніцтва скажае асноўныя дырэктывы партыі. Работнікі аддзелу кадраў да гэтага часу яшчэ не адмовіліся ад яўна-«лявацкай» установкі: «школа — цэх саўгасу».

Мы лічым, што Бельсельтрэст павінен прыняць неадкладныя захады па стварэньні неабходных умоў для падрыхтоўкі ў школах саўгасвучу патрэбных кадраў кваліфікаваных рабочых.

«Лявацкія» ўстаноўкі павінны быць выкрыты і выкаранены з практыкі работы савецкай школы.

КАРЗБІН.

Бабруйскі раён.

Мэдработнікі не атрымліваюць патрэбнай перакваліфікацыі

Больш трох год існуе пры наркамаце аховы здароўя інстытут удасканаленьня дактароў. Інстытут ставіць сваёй задачай — павысіць кваліфікацыю вучастковых работнікаў мэдыцыны, азнаёмць іх з навейшымі дасягненьнямі навукі ў мэдыцыне.

Мы вымушаны канстатаваць, што інстытут па перакваліфікацыі мэдычных кадраў не спраўляецца з задачамі, якія на яго ўскладае сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва. Перш за ўсё, у работе інстытуту няма ніякай сыстэмы і пляну. Адсутнічаюць канкрэтныя праграмы, не разьмеркаваны аддзелы паміж выкладчыкамі і зусім не распрацавана мэтодыка выкладаньня.

У інстытуце пануе абязьлічка і адсутнічае ўсякая адказнасьць за перавыхрытоўку мэдычных работнікаў. Так, хірургічная група разьмеркавана паміж 4-ма клінікамі. У кожнай з гэтых клінік па-розному адносіцца да курсантаў, па-розному іх знаёмяць з навейшымі дасягненьнямі ў мэдыцыне і падрыхтоўка цалкам залежыць ад ардынатараў і асыстэнтаў.

Мы вымушаны адзначыць, што Наркамат аховы здароўя ня прыняў літаральна ніякіх захадаў, каб забясьпечыць курсантаў жыльлёвай плошчай, стварыць патрэбныя бытавыя ўмовы для пасьпяховага навучаньня.

Стварэцца ўражаньне, што дарма выдаткоўваюцца дзяржаўныя сродкі, што інстытут не дае ніякай перакваліфікацыі вучастковым дактаром. І ў гэтым перш за ўсё вінавата існуючая сыстэма перападрыхтоўкі.

Наркамат аховы здароўя павінен аддаць значна больш ўвагі курсам па перападрыхтоўцы мэдычных работнікаў, ліквідаваць абязьлічку і безадказнасьць у выкладаньні.

Восем подпісаў.

Заняткі ащчэ не распачаты

Навучальны год у Капіцкай школе саўгасвучу яшчэ да гэтага часу не распачаты. Задача падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы для саўгасаў раёну вычэрпана ня будзе.

Аддзел нарасьветы адмаўляецца ад усякай дапамогі школе ў падшыпаньні кадраў выкладчыкаў, у рабоце па ўкамплектаваньні школы вучнямі, у пераглядзе і прыстасаваньні навучальных праграм. Інспэктар нарасьветы замусьці школу саўгасвучу ня лічыць патрэбным уключыць у сетку школ раёну і забясьпечыць яе мэтадычным кіраўніцтвам.

Адначасова трэба адзначыць, што школа ня ўключана ні ў якія пляны забясьпячэньня вучняў як вопраткай, абуткам, прадуктамі харчаваньня, так і вучэбнымі прыладамі.

Такое становішча прыводзіць да таго, што вучні дзесяткамі пакідаюць школу.

Мы патрабуем рашучага ўмяшаньня органаў РСІ.

В. ІЛЬЛІН.

Дрэнная арганізацыя работы сталовак--біч прамфінпляну

Многія сталоўкі віцебскіх прадпрыемстваў яшчэ ня сталі сапраўднымі цэхамі харчаваньня. Аб гэтым выразна гаворыць матар'ял выпікаў абсьледваньня рабочых сталовак.

Рабочыя швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн» заўсёды кідаюць работу за 10-15 мінут да гудка і самы абед цягнецца 30-40 мінут. Прычына — у арганізацыі работы сталоўкі. Справа ў тым, што абедаць павінны разам 250 чалавек, а крэслаў усяго толькі 140. І гэта ў той час, калі ў Віцебску крэслаў хоць адбаўляй.

Якасьць абедаў не заўсёды здавальняючая. На гаспадарчы разрахунак сталоўка гэтай фабрыкі не пераведзена. Ня ўведзена таксама зьдзельная аплата працы абслугоўваючага пэрсаналу. Між тым, колькасьць абслугоўваючага пэрсаналу (50 чалавек) пры ўведзеньні зьдзельшчыны можна значна зьменшыць.

У зусім дрэнным становішчы знаходзіцца рабочая сталоўка рамонтнага заводу «Камінтэрн». Гэту сталоўку забясьпечвае абедамі агульна-гарадзкая сталоўка. Якасьць абедаў дрэнная. Вызначаная норма на адзінку абеду значна зьменшана. Афіцыянтак няма. Рабочыя займаюцца самаабслугоўваньнем, у выніку ў сталоўцы беспарадак, вялізарныя чаргі. Ня гледзячы на халады, рабочым прыходзіцца шмат часу стаяць у чарзе на вуліцы. ЗРК мэталістаў можа лепш забясьпечыць рабочых абедамі, але адміністрацыя ня хоча паклапаціцца аб тым, каб набыць кацёл. Начыньнем сталоўка таксама забясьпечана у вельмі пазначнай колькасьці.

У крыху лепшым становішчы знаходзіцца сталоўка абутковай фабрыкі імя Лекерта. Чарга поўнасьцю ліквідавана. Абед працягваецца 14 мінут, начыньнем сталоўка забясьпечана. Але і тут ёсьць буйныя недахопы: спэцвопраткі не хапае, па зьдзельшчыну сталоўка не пераведзена, гаспадарчы разрахунак таксама не ўкаранён.

Работа паказаных сталовак — сьведка таго, што цэлы рад кіраўнікоў прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня не зразумелі сутнасьці гаспадарчага разрахунку і зьдзельшчыны, не зразумелі таго, што ўкараненьне гэтых мерапрыемстваў і ліквідацыя ўраўнілаўкі і абязьлічкі вырашаюць посьпехі паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Арк. Зарубежны, М. Вэйксон, Сурганаў.

РАШУЧАЙ ЛІКВІДАЦЫЯЙ АБЯЗЬЛІЧКІ ВАГОНАЎ

павысім іх карысную работу

КОЖНЫ НОВЫ АБМЕННЫ ПУНКТ—МОЦНЫ ЎДАР ПА БЕЗАДКАЗНАСЬЦІ, ПА АБЯЗЬЛІЧЦЕ

Вагон павінен працаваць 8 гадзін у суткі

Партыя паставіла баявую задачу перад чыгуначным транспартам—ліквідаваць абязьлічку таварнага парку і павялічыць карысную работу вагонаў на адну гадзіну ў суткі.

У якасьці важнейшых мерапрыемстваў па ліквідацыі абязьлічкі і павялічэньне эфэктнасьці выкарыстаньня вагоннага парку на аснове загаду тав. Андрэева з 1-га сьнежня г. г., арганізаваліся абменныя і рамонтныя пункты, а таксама пункты двухбаковага агляду на станцыі Менск, Ворша, Калінкавічы і інш.

Абменныя і рамонтныя пункты павінны быць забясьпечаны мэханічным абсталяваньнем, запаснымі часткамі, неабходнымі кадрамі, службовымі і жыльлёвымі памяшканьнямі. Аднак, на справе загад т. Андрэева ў гэтай частцы ня ўсюды выкананы.

Карэспандэнцыя з Менскага вузла сыгналізуе, што на асобных вучастках да ажыцьцяўленьня загаду тав. Андрэева падышлі фармальна, адмежаваліся толькі арганізацыяй пунктаў і не паклапаціліся аб забесьпячэньні гэтых пунктаў неабходнымі запаснымі часткамі, аб поўным укамплектаваньні кадрамі і г. д.

Такія адносіны да важнейшых мерапрыемстваў павінны быць рашуча вытручаны. З першага дня адкрыцьця пунктаў неабходна дабіцца бесьперабойнай работы іх.

Адным са сродкаў барацьбы за павялічэньне карыснай работы вагоннага парку вызначаецца таксама маршрутызацыя цягнікоў з тым, каб ня было сустрэчных перавозак, лішняга прастою вагонаў з прычыны чаканьня цягнікоў, адчэпак і прычэпак.

Да 1-га сьнежня г. г. трэба было давесьці маршрутызацыю цягнікоў па важнейшых грузах, (па лесе, вугалі, збожжы, солі, газе і інш.) на менш 60 проц. усіх грузаў, якія перавозяцца па чыгунцы. Гэты пункт загаду т. Андрэева яшчэ цалкам ня выкананы. У Віцебску, Магілеве, Калінкавічах, Воршы і інш. пунктах, дзесяткі цягнікоў фармуюцца не па маршрутах. Вагоны прастойваюць на гэтых станцыях вялікую колькасьць гадзін, чакаючы адчэпак і прычэпак. Трэба бязьлітасна выяўляць канкрэтных вінаватых, якія зрываюць баявыя мерапрыемствы новага кіраўніцтва НКЗШ па канчатковай ліквідацыі абязьлічкі вагоннага парку.

Толькі ліквідацыяй абязьлічкі вагонаў будзе дасягнута рэалізацыя таго пункту загаду т. Андрэева, дзе гаворыцца: «Выканаць як баявую задачу, забесьпячэньне ў чацьвертым квартале сярэднясутачнай работы вагонаў у руху ня менш 8 гадзін, супроць 6,8 гадз. у даны момант і па цысцэрнах—ня менш 11 гадз.».

З бальшавіцкай настойлівасьцю, пабаявому партыйныя арганізацыі чыгуначнага транспарту БССР, на чале ўсёй масы чыгуначнікаў, павінны змагацца за безадкладнае выкананьне задач т. Андрэева і пастановы лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб сацыялістычным транспарце.

Рамонтны пункт не забясьпечан запаснымі часткамі

З 1-га сьнежня на Менскім чыгуначным вузле пачалі работу абменныя і рамонтны пункты. Адведзены два спэцыяльныя шляхі: адзін — для прыёмкі і адпраўленьня цягнікоў і адзін — для рамонту. Да пункту прыкмандаваны начальнік дэпо па вагонай частцы, адзін старэйшы майстар і інш. Аднак, поўнасьцю пункт не ўкамплектаваны неабходнымі кадрамі кіраўніцтва нават ня недае, колькі трэба людзей.

Ня гледзячы на выразнае паказаньне пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб забесьпячэньні пунктаў неабходнымі запаснымі часткамі, Менскі рамонтны пункт не забясьпечан буфэрамі, стрыжнямі, балтамі, буфэрнымі варштатамі і інш. Ня выраблены пытаньне таксама і наконт жыльлёвых памяшканьняў. Адно памяшканьне, праўда, адведзена для тэхнічнага і канторскага пэрсаналу, але яно зусім не адпавядае прызначэньню. Характэрна, што адміністрацыя чыгуначнага вузла не ацэнсьціла нават некалькіх лістоў фанэры для рамонту паллогі гэтага памяшканьня. Адсутнічае кладоўка для хаваньня матар'ялаў з прычыны чаго апошні валяцца без нагляду. Няма таксама кузьняў і майстэрань.

Чыгуначныя арганізацыі Менскага вузла павінны ўжыць усе захады, каб зьнішчыць пералічаныя недахопы і арганізаваць бесьперабойную работу абменнага і рамонтнага пунктаў.

Зьнішчыць сустрэчныя перавозкі

Сустрэчныя перавозкі, зьмяншаюць карысную работу вагонаў, напосьць значныя страты чыгуначнаму транспарту, упосьць вялікую блытаніну ў работу і фактычна зрываюць выкананьне пляну перавозкі грузаў.

Асноўныя прычыны, якія павялічваюць сустрэчныя перавозкі: адсутнасьць належнага пляпаваньня і рэгуляваньня, зусім дрэнная работа пляпана-транспартных ячэек наркаматаў і рэспубліканскіх установ, дрэнны вуўчот і кантроль за ходам штодзённага выкананьня пляну перавозак грузаў і інш.

Трэба адзначыць, што гаспадарчыя і грамадзкія арганізацыі чыгуначнага транспарту, асабліва па Віцебскім і Жлобінскім раёнах, не вядуць рашучай барацьбы з паўторнымі сустрэчнымі перавозкамі. На большасьці станцый Віцебскага і Жлобінскага раёнаў нават адсутнічаюць справаздачы наводле установленай формы НКШЗ аб выкананьні пляновых перавозак.

Апошняя пастанова прэзыдыуму ЦКК і НК-РСІ БССР аб выкананьні пляну перавозак грузаў у кастрычніку і ў першай дэкадзе лістапада 1931 г. станцыямі Віцебск, Гомель, Ворша, Жлобін, Магілеў, Менск, Барысаў і інш. канстатуе рад абураючых фактаў сустрэчных перавозак. На Хойніцкай ветцы (Заходняя чыгунка) амаль кожны дзень паступае з розных канцоў круглы лес для лесапільнага заводу «Адраджэньне» і ў той жа час са станцыі Хойнікі круглы лес накіроўваецца ў сустрэчным напрамку па Крэснаборскі лесазавод (станцыя Аўра маўская).

У адрас Мазырскага райкаапсаюзу са станцыі Астанкевіч прыбыў вагон бульбы, які потым быў пераадпраўлен у Ленінград. 31-га кастрычніка са станцыі Гарочычы на станцыю Клінкавічы, прыбыў вагон бульбы, з якога рапей разгрузілі 4 000 кгр., а праз некаторы час гэты вагон дагрузілі і пераадправілі па ст. Мазыр у адрас крухмальнага заводу «Прудок». Паданыя факты ня вычэрпваюць усіх выпадкаў сустрэчных перавозак. Іх можна прывесьці значна больш.

З боку гаспадарчых арганізацый, як напрыклад з Белсельпрама, Сельхарчпрама, Белдзяржсьпірту і інш., наглядаюцца выпадкі прадстаўленьня чыгунцы заведама нерэальных заявак. Асабліва ў гэтым адзначаюцца мясцовыя аддзяленьні Белмяса, Белторфу і Лесазбыту.

На кастрычнік Белторф даў заяўку чыгунцы падаць 200 вагонаў па торфзавод, які знаходзіцца каля станцыі Васілевічы, у той час, як прапускная здольнасьць гэтага заводу ня больш 30 вагонаў у месяц. Гомельскае аддзяленьне Сельхарчпрому прадставіла па лістапад 1931 г. адказны плян перавозак для парфюмэрнай фабрыкі «Казімі» на 30 поўнагружаных вагонаў, у той час, як гэта фабрыка робіць выключна дробныя адпраўкі, якія могуць быць цалкам перавезены ў вагонах, адпушчаных Саюзтрансам пад дробныя грузы. У выніку такіх «пляпавых» заявак фабрыка «Казімі» ў першай дэкадзе лістапада адгрузіла толькі 2 вагоны, замест 10.

Да ліку ўстаноў, якія сыстэматычна не даюць рэальных заявак чыгункам і зрываюць нармальную пляновую работу, трэба аднесьці па Аршанскім і іншых эксплёатацыйных раёнах аддзяленьні: Лесазбыт, Белплодагародніну, Белмяса, Белдзяржсьпірт і Белсельхарч.

Кіраўнікі Віцебскага аддзяленьня Белмяса лічаць за лепшае сыстэматычна плаціць штраф, чым давать дэкадныя заяўкі на перавозку грузаў. За ўвесь час яны не далі чыгунцы ніводнай дэкаднай заяўкі.

Такое становішча далей зусім нецярпіма.

Прэзыдыум ЦКК і НК РСІ БССР даручыў памочніку пракурора рэспублікі па чыгуначным транспарце прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці ўсіх канкрэтных вінаватых, якія прадстаўлялі нерэальныя заяўкі на перавозку грузаў і дапускалі сустрэчныя перавозкі.

Побач з гэтым, у пастанове прэзыдыуму ЦКК і НК РСІ БССР намечан рад практычных мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць безадкладнае выкананьне сустрэчных перавозак і карэнным чынам палепшыць плянаваньне перавозак грузаў.

Начальнікам аддзелаў эксплёатацыі і кіраўніком мясцовых кантор Саюзтрансу па БССР даручана ня прымаць грузаў да перавозак у сустрэчным напрамку.

Прэзыдыум ЦКК НК-РСІ адпачасова прапанаваў мясцовай нарадзе па перавозках арганізаваць пяцідзённік жывой праверкі выкананьня пастановы камісіі выкананьня пры СНК БССР ад 8-га кастрычніка 1931 г. аб плянасьценьня-зімовых перавозак.

Шырокім удзелам усёй масы чыгуначнікаў даб'ецца канчатковай ліквідацыі сустрэчных перавозак і выкананьня бальшавіцкіх плянаў грузаперавозак трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Н. Г.

Сьвірыдаў

Задачы лясной прамысловасьці БССР

Бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, шпаркае разгортваньне індустрыялізацыі краіны, рост будаўніцтва ў сацыялістычным сэктары вёскі, разьвіцьцё транспарту і задачы выкананьня экспартнага пляну прад'яўляюць вялізарныя патрабаваньні да лясной прамысловасьці.

Лясная прамысловасьць БССР, разам з лясной прамысловасьцю Савецкага Саюзу, перавыканала пяцігодку, аднак, ажыцьцяўленьне павышаных заданьняў 1931 г. ідзе недавальняюча. Гадавы плян па загатоўцы дзелавой драўніны выкананы на 20 лістапада на 86 проц., па загатоўцы дроў—на 52 проц. па вывазцы страўных матар'ялаў—на 60,9 проц. і дроў—на 48,3 проц.

У 1932 г. лясная прамысловасьць БССР (па Белдзеспраме, за выключэньнем загатовак НКШЗ) павінна даць 5.200.000 кубаметраў дзелавой драўніны і 6 млн. кубаметраў дроў. Для выкананьня гэтых пляноў патрэбна каля 3 млн. чалавека-дзён, 8 млн. конадзён, апрача рабсілы на сплаве.

У зьвязку з напружанасьцю балансу рабгужсілы БССР, паўстае неадкладная задача—правільна арганізаваць набор рабочай і гужавой сілы, узьняць прадукцыйнасьць працы на лесараспрацоўках, правесьці мэханізацыю і рацыяналізацыю лясных работ.

Чацьверты квартал паказаў, што перабоўка рабгужсілы по паладжана, што яна не носіць арганізаванага характару, што ніякай увагі не аддаецца якасьці перабоўкі, што не разгорнута работа па заключэньні дагавораў з калгасамі, калгаснікамі, бедняцкімі і батрацкімі. Справа на ў фармальным заключэньні дагавораў, якое праводзіцца больш-менш здавальняюча, а ў кантролі за выкананьнем. Можна прывесьці рад прыкладаў, калі па прычыне слабой масава-растлумачальнай работы, адсутнасьці дагаваронасьці з калгасамі, калгаснікі, якія жадаюць ісьці на работу ў лес, затрымліваюцца праўленьнямі, калі калгасы не ўсьвядомілі сабе значэньня іх удзелу ў лесазагатоўках. У чацьвертым квартале заключана дагавораў з калгасамі і калгаснікамі на 28 тысяч лесарубаў; фактычна працуе каля 4.000, або 15 проц. да ліку завербаваных. Возчыкаў-калгаснікаў завербавана 25.040, працуе 926, або 3,9 проц.

Дагэтуль вялікую ролю ў рабоце ў лесе адыгрывала так званая «сэзоннасьць»—стаўка на сухую восень, добрую зіму. Зараз рашуча паўстае пытаньне аб ліквідацыі сэзоннасьці ў рабоце, аб стварэньні пастаянных кадраў лесарубаў і возчыкаў.

Дырэктыва ЦК і СНК аб вярбоўцы 6.000 пастаянных лесарубаў фармальна выконваецца, але справа заключаецца ня столькі ў вярбоўцы рабочых, колькі ў стварэньні ўмоў, якія-б гарантавалі спыненьне цякучасьці рабочай сілы.

Перад лясными гаспадарчымі арганізацыямі, прафсаюзамі, лясной каапэрацыяй стаяць неадкладныя задачы—забясьпечыць лесарубаў жыльлём, арганізаваць грамадзкае харчаваньне, забясьпечыць харчэй і прамтаварамі, пакінуць культурнае і мэдычнае абслугоўваньне. Без вырашэньня гэтых задач па можа быць гутэраж аб тым, што ў лесе ёсьць пастаянны кадр рабочых, бяз гэтага цякучасьць рабочай сілы нямінуча.

Старыя дзедаўскія мэтады так званай «парнай» і, арцельнай работы ні ў якім разе не забясьпечвалі ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы лесарубаў і возчыкаў, стымуляваньня сапраўды ўдарнай работы.

Рад леспрамгасаў ня выканалі пастановы партыі і ўраду аб перавозе на брыгадным мэтады ня менш 75 проц. усіх лесарубаў. На 10 лістапада ахоплена брыгадамі каля 2.000 чалавек, або менш 10 проц. агульнай колькасьці рабочых лясной прамысловасьці.

Між тым брыгадныя мэтады работы адкрываюць вялікія перспэктывы для ўзьняцьця выпрацоўкі, правільнага разьмеркаваньня працы, дыфэрэнцыяцыі аплаты ў залежнасьці ад працэсаў работы, павышэньня кваліфікацыі лесарубаў і г. д.

Да апошняга часу ў аплаце працы лесарубаў і возчыкаў панавала ўраўнілаўка. Толькі 26 лістапада падпісан дагавор з саюзам лесдрэўрабочых аб увядзеньні прэміяльна-прагрэсіўнай зьдзельшчыны на лясных работах.

Факты паказваюць, што ўвядзеньне простага прэміяваньня за выкананьне норм лесан або грашыма, (пры выкананьні норм—премія ў памеры 5 проц. зарплаты, за перавыкананьне — да 15 проц. нормы—премія 5 проц., звыш 15 проц.—16 проц. выработку), выклікала вялікую задавальненасьць і дало добрыя вынікі ў рабоце ў лесе. Вялікі прыток рабсілы ў лес вымусіла таксама пастанова ўраду аб ільготах па сельгаспадатку адыходнікам па лясных работы. На жаль, гэта пастанова пакуль што вельмі слаба папулярызавана сярод шырокіх мас вёскі.

Дагавор на ўвядзеньне прэміяльна-прагрэсіўнай зьдзельшчыны прадугледжвае аплату за кожны выпрацаваны звыш нормы кубамэтр, прагрэсіўна павялічанай стаўкай. Заработак рабочага, які працуе ў брыгадзе, устанаў ляецца вышэй на 10 проц. чым іншых рабочых, аплата пастаянных кадраў вышэй зарплаты сэзоньнікаў па 20 проц.

Новы парадак аплаты дае поўную магчымасьць скарыстаць жапчын і падростаў на менш-кваліфікаванай працы—абрубка сучча, акорка ўкладка сучча. Раней менш складаныя і больш лёгкія працэсы выконваліся кваліфікаванымі лесарубамі, якія з прычыны ўраўнілаўкі ня былі зацікаўлены ў выкананьні больш складаных работ.

Вялікае значэньне ў адносінах павялічэньня прадукцыйнасьці працы на лесараспрацоўках набывае мэханізацыя загатовак і вывазу лесаматар'ялаў і дроў. Да апошняга часу ў галіне мэханізацыі было зроблена вельмі мала. Лесбел мае толькі 28 маторных піл, якія ў большасьці не працуюць. Асобныя леспрамгасы па прычыне інэртнасьці і кансэрватызму, некаторых работнікаў, ігнаруюць увядзеньне спружынных піл на лесараспрацоўках. Зусім слаба мэханізавана вывазка лесу. Есьць толькі тры вусенічныя трактары, у той час, калі МТС і саўгасы БССР маюць дзесяткі вусенічных трактароў, якія ўзімку не скарыстоўваюцца.

Лесбел павінен дабіцца атрыманьня гэтых трактараў для работы ў лесе і забясьпечыць іх прычэпнымі часткамі.

Вядома, што коні, якія працуюць у лесе, часта ня маюць поўнай нагрузкі, у сувязі з дрэнным станам дарог і труднасьцямі вывазу загатоўленых матар'ялаў з лесу. Між тым, самая простая рацыяналізацыя—пабудова дрыўляна-лежнявых дарог,—паляпшэньне санных шляхоў—дае вялікі эфэкт у адносінах павялічэньня вывазкі лесу. У той час, калі на грунтовай дарозе коням цяжка вывезьці 1 кубамэтр драўніны, дык на лежнявой дарозе конь лёгка вязе 3½-4 кбм. Трасы лежнявых дарог узімку можна ўкатаць і зрабіць палепшаныя санныя шляхі. Аднак, справе рацыяналізацыі вывазкі лесазагатоўчыя арганізацыі не надаюць належнай увагі, ня ўлічваюць таго эфэкту, якое яна дае. У гэтым годзе пабудавана 97 клм. дрыўляна-лежнявых дарог, але іх утрыманьнем ніхто ня цікавіцца.

Перад лясной прамысловасьцю—непачаты край работы ў галіне мэханізацыі і рацыяналізацыі загатовак. Трэба сьмела ўзяцца за ўкараненьне мэханізмаў на лясных і сплаўных работах—нагрузачных трактараў, сплоточных машын, пружынных і маторных піл і г. д.

Трэба выхаваць грамадзкую думку лясных рабочых, ПТР па адшуканьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія можна было-б правесьці мабілізаваўшы ўнутраныя рэсурсы.

Лесбел мае 3 вузка-калейныя веткі. Аднак, іх работа пастаўлена зусім безгаспадарча. Няма запікаўленасьці адміністрацыйна - тэхнічнага апарату, мінімальнага паравозу, рабочых па нарэзцы ў павялічэньні прадукцыйнай здольнасьці веткі. Апошнія не працуюць нават у дзень выплаты, не гаворачы ўжо аб перавозе іх на бесьперапынку і трохзьменную працу. Паравозныя брыгады не пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Адсюль вялікія прастої паравозаў у рамонце і г. д.

Аб тым, што на мясцох далёка яшчэ ня ўсюды зжыты кансэрватызм у адносінах увядзеньня новых мэтадаў работы, сьведчыць гісторыя Дулебскай веткі, будаўніцтва якой ідзе надзвычай павольна.

Доўгі час не маглі знайсьці рэек, атрымалі нарэшце рэйкі, няма кастылёў і балтоў. Шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, знайшлі кастылі і балты на 10 клм., не хапае толькі 3-х тон балтоў, каб скончыць ветку. Калі-б на мясцы своячасова праявілі належную распарадчасьць і гібкасьць, дык цяпер можна было атрымаць гэтыя балты і скончыць будаўніцтва.

На Гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце ёсьць балтарэзны варштат, які дае ў дзень паўтоны балтоў.

Адна з галоўных задач — максымальна-рацыянальнае скарыстаньне драўніны ў лесе. Вялікую колькасьць каштоўных парод (клён, граб, бяроза) сякуць на дровы, замест таго, каб скарыстаць яе на выраб каштоўнага паўфабрыкату для дрэваапрацоўчых заводаў. Наогул, у лесе застаецца вялікая колькасьць адыходаў, якія гніюць і засьмечваюць лес. Трэба ўстанавіць у лесе шырокую сетку невялікіх, нескладаных, мэханічных прыладаў для распрацоўкі адыходаў. Можна вышукаць рухавікі і цыркуляркі ў парадку мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Затраты на гэтыя ўстаноўкі акупяцца ў самы кароткі час. Бракаціроўка адпадаў, якія застаюцца ў лесе, дала-б магчымасьць атрымаць вялікую колькасьць новага віду апалу, і палепшыла-бы напружаны апалавы баланс.

Перад лясными гаспадарчымі арганізацыямі стаіць задача стварэньне ўласнага абозу. Лесбел зараз мае абоз у 4.000 коняй. У 1932 г. мяркуецца давесьці яго да 6.000 коняй. Уласны абоз зможа на працягу году, (калі ўзяць сярэднюю норму—паўтары кубаметры ў дзень і памножыць на 260 рабочых дзён) — вывезьці 45 проц. усёй праграмы па будаўнічых матар'ялах.

Дагэтуль работа ўласнага транспарту давала адмоўныя вынікі. Адсутнасьць уліку, адсутнасьць гаспадарчага разрахунку прыводзілі да скарыстаньня коняй не па прызначэньні, да непоўнай нагрузкі гужавой сілы і г. д. Абязьлічка і ўраўнілаўка ў зарплаце падрывалі работу транспарту. Зараз у сувязі з пераводам леспрамгасаў на гаспадарчы разрахунак, уведзена прэміяльна-прагрэсіўная аплата работы пастаянных возчыкаў, уведзены падбаўкі за перавыкананьне норм за ўтрыманьне каня ў добрым выглядзе. Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў павінна зрабіць уласны абоз сур'ёзным фактарам выкананьня праграмы вывазкі.

Асноўныя задачы лясной прамысловасьці— гэта ўкараненьне сацыялістычных мэтадаў працы ў лесе, ператварэньне адсталага лесаруба ў пралетара-ўдарніка, рашучае паляпшэньне партыйна-масавай, прафэсыянальнай і каапэраціўнай работы на лесазагатоўках. Толькі тады, калі партыйныя, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі па-новаму перабудуюць сваю работу і на справ

Замест эвакуацыі—новыя ваенныя брыгады ў Манчжурыю

Японія замацоўвае захвачаную тэрыторыю

Банкі і біржа прагнуць вайны з СССР

Антысавецкія пляны выпрацаваны ў Парыжы

ПАРЫЖ, 30. «Юманітэ» паведамляе радзе арганізаваных у Парыжы і ў правінцыі мітынгаў пратэсту супроць імпэрыялістычнай вайны. Газэта публікуе адозвы ЦК ФРАНЦУСКАЙ КАМПАРТЫІ І КАМСАМОЛУ З ЗАКЛІКАМ ДА ЎДЗЕЛУ Ў МАСАВЫМ МІТЫНГУ 1 СЬНЕЖНЯ Ў ПАРЫЖЫ.

Вядучы сыстэматычную кампанію супроць вайны, «Юманітэ» ў нумары ад 30 лістапада зьмяшчае артыкул Габрыэля Пэры. У гэтым артыкуле ўказваецца, што ПРАЕКТЫ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ АРГАНІЗАВАЦЬ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Ў МАНЧЖУРЫІ ВЫПРАЦАВАНЫ НЕ Ў МАНЧЖУРЫІ, А Ў ПАРЫЖЫ, ДЗЕ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІ ГЕНЭРАЛ МІЛЬЛЕР ВЯДЗЕ ЦЕСНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ПЭЎНЫМІ ФРАНЦУСКІМІ КОЛАМІ.

Габрыэль Пэры ў сьпгляде ілюстрацыі СПАСЫЛАЕЦЦА НА АРТЫКУЛ, ЗЬМЕШЧАНЫ Ў НУМАРЫ «МАТЭЧ», АД 30 ЛІСТАПАДА, ДЗЕ НА ПЕРШАЙ СТАРОНЦЫ БЫЛА АПУБЛІКАВАНА БІЯГРАФІЯ СЯМЕНАВА, НАПІСАНАЯ Ў АНТЫСАВЕЦКІМ ТОНЕ РАМАНІС. ТАМ КЭЗЭЛЕМ.

«Юманітэ» падае артыкул старшыні франка-ангельскай ганлёвай палаты ў Лёндане Нода ў адным з самых папулярных правінцыяльных французскіх органаў «Піці Марсэльез». У гэтым артыкуле Нода заяўляе: «НЯ ТРЭБА ЗАБЫВАЦЬ, ШТО ФАКТ ЗНАХОДЖАНЬНЯ ЯПОНСКАЙ АРМІІ НЕДАЛЁКА АД СІБІРЫ ДЗЕЙНІЧАЕ АХАЛОДЖВАЮЧА НА АКТЫЎНАСЬЦЬ СССР».

Апрача таго «Юманітэ» цытуе штотыднёвы цыркуляр «вучотна-крэдытнага бюро па справах тупевай прамысловасьці». У гэтым цыркуляры гаворыцца:

«НЯ БУДЗЕМ ТРАЦІЦЬ НАДЗЕІ. КАНФЛІКТ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ, ХОЦЬ І НЯ ВЫРАШЫЦЬ КРЫЗІСУ, АДНАК БУДЗЕ МЕЦЬ ЗУСІМ СПРЫЯЮЧЫ ЭФЭКТ. БУЙНЫ КАНФЛІКТ, ЯКІ ЎВЕСЬ ЧАС ЧАКАЎСЯ, УЖО Ў НАЯЎНАСЬЦІ. ТРЭБА ПРАДБАЧЫЦЬ ЗАМЯШАНАСЬЦЬ Ў СІБІРЫ І СНАБЖЭНЬНЕ З БОКУ ЯПОНІІ ЗБРОЯЙ АНТЫСАВЕЦКІХ ЗЛЕМЭНТАЎ. ЗА ГЭТЫМ КАНФЛІКТАМ ПАСЬЛЕДУЮЦЬ, ВІДАВОЧНА, І ІНШЫЯ Ў РЭЗУЛЬТАЦЕ ПАГРАНІЧНЫХ ІНЦЫДЭНТАЎ ПАМІЖ СССР І ЯГО СУСЕДЗЯМІ, ШТО ПРЫВЯДЗЕ ДА АГУЛЬНАГА АЖЫЎЛЕНЬНЯ СПРАЎ».

Падаючы ўсе гэтыя АНТЫСАВЕЦКІЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ, «ЮМАНІТЭ» ЗАКЛІКАЕ РАБОЧЫЯ МАСЫ МАБІЛІЗАВАЦЦА СУПРОЦЬ ГЭТАЙ «ПАЛІТЫКІ ВАЙНЫ, ЯКАЯ ЗАДУМАНА БАНКАЎСКІМІ КОЛАМІ».

Толькі ў савецкіх раёнах Кітаю зьнішчан уціск імпэрыялістаў

Ядозва ўрадаў савецкіх раёнаў Кітаю

БЭРЛІН, 24. Тут атрымана з вялікім апазьненьнем адозва ўрадаў савецкіх раёнаў Кітаю з прычыны захопу Манчжурыі японскімі імпэрыялістамі. Адозва падпісана прадстаўнікамі правіцельных савецкіх урадаў паўдзённа-заходняга Цьзянсі, Фуцзяна, Гуандуня, Цьзянсі, Хунані, Хубэй і Аньхуэя, якія знаходзяцца ў Шанхаі, і абласных савецкіх урадаў паўднёвай і ўсходняй Хэнані, Хубэй-Хэнаньскай пагранічнай вобласьці, Хунані, Цьзянсі і Шаньсі-Суйаньскай пагранічнай вобласьці і інш. урадаў.

«Толькі савецкі ўрад рабочых, сялян і салдат, — гаворыцца ў адозве, — **зьяўляецца тэй сілай, якая безагаворачна і непрымірыма змагаецца за зьвяржэньне імпэрыялізму.** Кітайскія саветы на справе паказалі сваю рашучасьць у барацьбе за сапраўды нацыянальнае вызваленьне і за самастойнасьць. У іх праграме знаходзіцца адмаўленьне ад прызнаньня ўсіх прадастаўленых Кітаю імпэрыялістычных пазык, скасаваньне ўсіх няроўных дагавораў, ачышчэньне Кітаю ад усіх імпэрыялістычных ваенных сіл і канфіскацыя маемасьці ўсіх імпэрыялістаў у Кітаі.

У нашых савецкіх абласьцях ня існуе больш імпэрыялістычнай эксплёатацыі і прыгнечанасьці. Іменна таму ім імпэрыялісты і гаміндан ня раз мабілізавалі свае ваенныя сілы супроць савецкіх абласьцей і іх чырвонай арміі. Імпэрыялісты хочуць агнём і мячом разграміць кітайскія саветы і цалкам падпачаліць Кітай калёніяльнай прыгнечанасьці.

Кітайскія саветы і рэвалюцыя крочаць наперад. Пасьля вялікіх перамог кітайскай чырвонай рабоча-селянскай арміі ў найшырэйшых народных масах Кітаю яшчэ больш моцнай стане вера ў тое, што толькі саветы рабочых, сялян і салдат з іх Чырвонай арміяй разабіюць панаваньне імпэрыялістаў і гаміндану і вызваляць Кітай ад гэтага панаваньня.

Рабочыя, сяляне, салдаты і працоўнае насельніцтва Кітаю! Аб'яднайцеся для зьнішчэньня панаваньня імпэрыялістаў і гаміндану, для стварэньня савецкай улады, вашай уласнай улады. Гэта — адзіны выхад для насельніцтва Кітаю, якое эксплёатуецца і прыгнятаецца.

Новая японская брыгада прыбыла ў Цыцыкар

ТОКІЁ, 2. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго, японская брыгада пад камандаваньнем Сузукі сёньня ўступіла ў Цыцыкар. (ТАСС).

Ствараецца „манчжурскае генэрал-губарнатарства"

ТОКІЁ, 3. У кіруючых японскіх колах, у першую чаргу ў ваенных, абмяркоўваецца пытаньне аб стварэньні апарату для ажыцьцяўленьня японскай палітыкі ў Манчжурыі. Газэта «Цугаі» паведамляе, што ваенная рада 1-га сьнежня пастанавіла, што «ў выпадку адводу войск Чжан Сюэ-ляна з Цінічжоу ваенныя апэрацыі ў Манчжурыі можна будзе лічыць закончанымі, і манчжурскае пытаньне нарэшце ў стадыю вырашэньня яго дыплёматычным шляхам». У пастанове ўказваецца таксама на шкоднасьць з пункту погляду японскіх інтарэсаў паяўнасьці «чатырохначальля» ў Манчжурыі (старшыня П.-М. чыг., японскі генэральны консул, камандуючы квантунскай арміяй і губарнатар Квантуна). Ваенная рада мяркуе стварыць «манчжурскае генэрал-губарнатарства» на чале з генэрал-губарнатарам, якому падначальваюцца гэтыя чатыры кіраўнікі.

* * *

ТОКІЁ, 3. Мукдэнскі карэспандэнт «Асахі», указваючы на тое, што манчжурскае пытаньне ўступіла ў другі пэрыяд, у «пэрыяд канструкцыйны», паведамляе, што ўплывовыя мукдэнскія колы (японскія) распрацоўваюць розныя пляны, у тым ліку і пляны на палітычнай лініі. Аспэтным імкненьнем усіх гэтых плянаў зьяўляецца жаданьне пакончыць у першую чаргу з «традыцыйнай памылкай у пытаньнях манчжурскай палітыкі», якая заключаецца ў паяўнасьці 4-х начальнікаў. Замест іх павінен быць створан адзін цэнтральны апарат у Манчжурыі пад кіраўніцтвам генэрал-губарнатара. Падкрэсьліваецца, што на пост генэрал-губарнатара павінен быць назначан «буйнейшы дзеяч, які можа, як роўны з роўным, весьці перагаворы, а таксама і розныя споры з новай уладай у Манчжурыі. (ТАСС).

Пралетарыят Францыі—на варце СССР і Кітайскіх Саветаў

Буры мітынг пратэсту ў Парыжы

ПАРЫЖ, 2. Арганізаваны французкай кампартыяй мітынг супроць імпэрыялістычнай вайны і ў абарону СССР прайшоў з выключным энтузіязмам. На мітынгу прымалі ўдзел многія тысячы рабочых Парыскага раёну.

Ужо за некалькі гадзін да адкрыцьця мітынгу ўсе вуліцы і пляцы па суседзтве з мітынгам былі заняты вялікімі атрадамі паліцыі, пешай і конкай жандармэрыяй. Мітынг быў адкрыт пад старшынствам сакратара ЦК кампартыі Францыі тав. Сэмара.

Інда-кітайскі рабочы, які зьяўляецца на трыбуне, сустракаецца шумнымі воклічамі. Ён заклікае французкіх рабочых вырваць з турмаў і выратаваць ад пагрозы сьмерці сотні арыштаваных французкімі ўладамі інда-кітайскіх рэвалюцыянэраў.

Тав. Марты, спатканы «Інтэрнацыяналам», у гарачым выступленьні прапісталяе магутнае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР эканамічнаму крызісу, які ўсё больш узмацняецца ў капіталістычных краінах, і вітае посьпехі пяцігодкі, што завяршаецца за чатыры гады. Расказваючы аб сваёй паездзе ў Савецкі Саюз, тав. Марты апісвае грандыёзнае прамысловае будаўніцтва ў Магнітагорску і Чалябінску, посьпехі калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР, указвае, што ўмовы жыцьця працоўных Савецкага Саюзу паляпшаюцца з кожным месяцам.

У заключэньне тав. Марты зачытвае лісты, атрыманыя ад групы «чырвоных маракоў», якія знаходзяцца пад арыштам. У сваім лісьце маракі заяўляюць, што яны ніколі ня выступяць супроць кітайскіх або рускіх саветаў. **«Калі нас,—пішуць маракі,—пашлюць супроць іх, мы паступім, як нашы чорнаморскія маракі—будзем братацца і змагацца за пралетарскую рэвалюцыю».**

Тав. Марты канчае гарачым заклікам уступіць у кампартыю, якая зьяўляецца адзіным абаронцам пралетарыяту.

На трыбуне зьяўляецца **тав. Дорыё,** якога сустракаюць пяяньнем «Інтэрнацыяналу». Тав. Дорыё малюе карціну вайны, што адбываецца ў Манчжурыі, растлумачвае не прычыны і мэты, напамінае гісторыю імпэрыялістычных замахаў Японіі на Манчжурыю. Тав. Дорыё заклікае парыскіх рабочых да энэргічных выступленьняў супроць вайны, за эвакуацыю японскіх войск з Манчжурыі, за адкліканьне эўрапэйскіх морскіх сіл з кітайскіх мораў.

«Калі выбухне вайна,—заяўляе т. Дорыё,—вы выканаеце ваш клясавы абавязак—арганізуеце адзіны фронт у абарону СССР і супроць вайны».

У заключэньне ўдзельнікі мітынгу прымаюць рэзалюцыю, у якой ганьбяць намаганьні імпэрыялістаў выклікаць вайну, выкрываюць здрадніцкую ролю сацыялістаў і іншых здрадніцкай справе пралетарыяту і абавязваюцца абараняць СССР і кітайскія саветы.

Таксама прымаецца рэзалюцыя, у якой прысутныя ганьбяць фашысцкіх забойцаў беларускіх пралетараў.

Паводле вестак «Юманітэ» пры выхадзе з мітынгу адбыліся сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй. Некалькі рабочых арыштавана. (ТАСС).

За ўдзел у антыімпэрыялістычным мітынгу—

кара сьмерцю праз павешаньне

Масавае забойства рэвалюцыйных рабочых і сялян у Польшчы

ЗНОЎ КАРА СЬМЕРЦЮ ДЛЯ 2-х РАБОЧЫХ

БЭРЛІН, 3. Як паведамляюць з Варшавы, палявы суд Петракова прыгаварыў да кары сьмерцю праз павешаньне двух рабочых — 29-гадовага Малеўскага і 30-гадовага Закржэўскага за ўдзел 3-га лістапада ў антымілітарысцкім мітынгу ў абарону СССР перад буйнейшай польскай фабрыкай штучнага шоўку ў Тамашове.

ЦК кампартыі Польшчы зьвярнуўся з адозвай да міжнароднага пралетарыяту выступіць з пратэстам супроць прывядзеньня ў выкананьне прыгавору і супроць масавых забойстваў рэвалюцыйных рабочых і сялян у Польшчы.

(ТАСС).

Беспрацоўе расьце бязупынка

Як паведамляе буржуазная польская праса, на працягу апошняга месяца беспрацоўе значна павялічылася. Апрача 257.000 беспрацоўных польская статыстыка адзначыла яшчэ 123.583 рабочыя, якія працуюць толькі 2-3 дні ў тыдзень. У сапраўднасьці колькасьць беспрацоўных значна большая. Па тэрыторыі ўсёй Польшчы кожны дзень закрываюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, павялічваецца масавае скарачэньне рабочых.

Сацыял-фашысцкі «Роботнік» паведамляе, што ў адной толькі Быдгоскай акрузе па працягу апошняга тыдня закрыта 11 прамысловых прадпрыемстваў і звольнена некалькі тысяч рабочых.

Школы ў Польшы—гнёзды шпіянажу

ВАРШАВА. Катавіцкая «Полёнія» піша, што мясцовае бюро ўрадавага «беспартыйнага блёку» разаслала настаўнікам усіх школ навоту анкету для запаўненьня з 31 пытаньня. Гэта анкета надзвычай выразна сьведчыць аб ролі школы ў фашысцкай Польшчы. Сярод пытаньняў ёсьць, напрыклад, такія: пытаньне 13. Ці арганізавана па-зашкольная моладзь і калі так, дык у якіх арганізацыях і хто стаіць на чале гэтых арганізацый? Пытаньне 7. Якія палітычныя арганізацыі існуюць у вашым раёне і хто стаіць на чале іх? Пытаньне 26. Якія газэты і журналы выпісвае насельніцтва вашай мясцовасьці і г. д.

15.000 гарнякоў выкідаюцца на вуліцу

Катавіцкая «Полёнія» (эндэцкая) падае з паінфармаваных крыніц, што ў жалезнай прамысловасьці ў Верхняй Сілезіі ў хуткім часе мае быць звольнена **15.000 гарнякоў.** Весткі гэтыя зьяўляюцца тым больш праўдападобнымі, што ўжо ў канцы лістапада прамысловцы зьвярнуліся да дэмабілізацыйнага камісара з прапановай аб звальненьні 10.000 рабочых з жалезных гут.

Праўда, на апошняй канфэрэнцыі ў верхня-сілескага ваяводы гэты апошні запэўніў рабочых дэлегатаў, што «ўлада ні ў якім выпадку не дапусьціць далейшага скарачэньня рабочых», аднак, тут-жа заявіў, што «ў жалезаапрацоўчай прамысловасьці колькасьць рабочых павінна быць прыстасавана да заказаў». У апошнія-ж часы, як падае фашысцкая праса, у жалезаапрацоўчай прамысловасьці Польшчы адзначылася катастрафічнае зьмяншэньне заказаў.

Трэба адзначыць, што ў 1924 годзе ў жалезнай прамысловасьці Верхняй Сілезіі працавалі **42.000 рабочых,** з таго часу скарочана звыш 15.000 чал. і зараз зноў **15.000 рабочых** выкідваецца на вуліцу.

Эканамічная вайна абвастраецца

Кантрмеры францускага ўраду

ЛЕНДАН, 1. Газэты паведамляюць, што па распараджэньні францускага ўраду колькасьць ангельскага вугалю, якую дазволена вывезьці ва Францыю, зьнижана з 1-га сьнежня на 1 млн. тон, у параўнаньні з максымумам, устаноўленым у жніўні. Газэта піша, што ў сувязі з абмежаваньнем увозу ангельскага вугалю ва Францыю, цэлы рад каналень у Паўднёвым Уэльсе (якія пастаўляюць вугаль галоўным чынам для экспарту ва Францыю) перайшлі па 2-х дзенны рабочы тыдзень, замест іспаваўшага дагэтуль 4-хдзённага рабочага тыдню. Паводле падлікаў газэты, гэта скарачэньне пазбавіць работы **больш 9-ці тыс. гарнякоў.**

Зноў рэзкае падзеньне фунту стэрлінгаў

ПАРЫЖ, 2. Учора на парыскай біржы зноў адзначылася **рэзкае падзеньне фунту стэрлінгаў:** за фунт плацілі толькі **83** франкі супроць **87** напярэдадні. Адзначаецца таксама агульнае зьнижэньне каштоўнасьцей, якое даходзіць да аднаго процанту. Паводле слоў «Эпфармасьен» біржа знаходзілася пад уплывам няўпэўненасьці далейшага лёсу фунту і пэрспэктывы завастрэньня мытнай вайны ў сувязі з далейшымі пратэкцыяністкімі мерапрыемствамі Англіі. (ТАСС).

Няма ніякіх надзей

ЛЕНДАН, 2. Афіцыяльна абвешчана, што міністэрства фінансаў прапягнула да 14-га сьнежня дзейнасьць пастановы, якая дазваляе **павялічыць колькасьць папяровых грашовых знакаў з 260 млн. фунтаў стэрлінгаў да 275 млн.** У фінансавых колах сьцьвярджаюць, што пытаньне аб далейшым павялічэньні выпуску папяровых грошай пастаўлена **і што няма ніякіх надзей на зварот да нармальнага становішча.** (ТАСС).

Банкруцтва буйнейшай Амэрыканскай чыгуначнай кампаніі

НЮ-ЕРК, 2. Збанкрутавала буйнейшая чыгуначная кампанія «Уэбэш Рэйлерсад». Чыгунка ня ў стане плаціць процанты па сваіх аблігацыях на суму 151 млн. даляраў. Галоўную ролю ў перавозках кампаніі складалі аўтамабілі, якія дастаўляліся з Дэтройту, дзе гэта дарога пачынаецца. Скарачэньне аўтамабільнай прадукцыі рэзка скараціла і даходы чыгункі, якая за апошнія месяцы панесла вялікія страты. Кошт акцый чыгункі зьнізіўся да 4 даляраў супроць 81 даляра ў 1929 годзе. Банкрутства гэта прадстаўляе сабою першае буйное чыгуначнае банкрутства з пачатку крызісу. Трэба адзначыць, што другія буйнейшыя чыгункі таксама нясуць буйнейшыя страты ў сувязі з рэзкім скарачэньнем як таварных, так і пасажырскіх перавозак

Эканамічны крызіс у Японіі паглыбляецца

ТОКІЁ. З прычыны зьмяншэньня японскага экспарту ў Кітай і далейшага паглыбленьня крызісу ў самой Японіі, таварыства тэкстыльных прамыслоўцаў пастанавіла зьменшыць прадукцыю **на 35 проц.** Рабочыя масамі выкідваюцца на вуліцу. Фабрыкі, якія маюць верацёны самай навейшай канструкцыі, зьменшылі вытворчасьць **на 63 проц.**

Ёмба рабочых, выкінутых з гэтых фабрык, складае **78 проц.**

Асабліва моцна адчуваецца крызіс у галіне дзяржаўных даходаў, якія ў апошнім месяцы зьменшыліся **на 23 млн.** У сувязі з расходамі на ваенную авантуру ў Манчжурыі, якія ўсё павялічваюцца, японскі ўрад выпускае пазыку ў 250 млн. іен. Дэфіцыт бюджэту ўжо раўняецца 150 млн.

Японскія эканамісты малююць сумную пэрспэктыву для Японіі. Яны сьцьвярджаюць, што калі японскі экспарт у Кітаі будзе зьмяншацца з такой-жа катастрафічнай шпаркасьцю, як зараз, **дык японскія капіталісты каўзабаве апынуцца на краі бяздоньня.** Тыя-ж самыя эканамісты пішуць, што Амэрыка зацікаўлена ва ўцягненьні Японіі ў вір ваеннага канфлікту, каб эканамічна не аслабіць, а далей выцягнуць з гэтага палітычную карысьць.

Японскія эканамісты перасьцерагаюць японскіх імпэрыялістаў і падаюць вытрымку з францускай газэты аб тым, што ваюючыя бакі не ўзбагачаюцца на вайне, затое на вайне багацеюць суседзі.

Думку цьвярозых японскіх эканамістаў падзяляюць і значныя колы прафэсароў. Таму японскі ўрад у адпісках да многіх прафэсароў ужыў тэрор. Напрыклад, у Токіё некалькі прафэсараў прыгавораны да хатняга арышту на неабмежаваны час.

Масавае банкруцтва прамыслова-гандлёвых прадпрыемстваў

ВАРШАВА. «Газэта Варшавска» ў адным са сваіх апошніх нумароў падае вялікі сьпіс збанкрутаваных у апошні час гандлёва - прамысловых прадпрыемстваў у Варшаве і ў іншых прамысловых цэнтрах Польшчы.

На маемасьць многіх фірм накладзен судовы арышт. Многія фірмы знаходзяцца напярэдадні поўнай ліквідацыі. Супроць раду прадпрыемстваў (у Катавіцах, Львове і інш.) пачата судовае следзьтва па абвінавачаньні ў «злосным банкруцтве».

Фірмы, якія атрымалі часовае адтэрмінаваньне выплат, сьпешна ліквідуюць свае запасы тавараў па надзвычай нізкіх цэнах, ствараючы такім чынам вострую канкурэнцыю для прадпрыемстваў, якія яшчэ сяк-так трымаюцца.

Здань галоднай сьмерці

(Ліст з Рыгі)

Яна вітае над тысячамі пралетарскіх дзяцей гораду Рыгі. У аддзеле працы Рыскай гарадзкой управы зарэгістравана 4.000 дзяцей беспрацоўных, якім, паводле слоў буржуазных газэт, «дапамога патрэбна неадкладна». У гарадзкіх дзіцячых прытулках размешчана толькі 916 дзяцей. Прытулкі так перапоўнены, што няма ні аднаго вольнага месца,—56 дзяцей размешчаны ў прытулкі звыш усякай нормы. **А між тым,** лік бяздомных дзяцей усё расьце. За апошнія дні вы селены з кватэр 2.000 беспрацоўных, —буржуазны закон гэта дапускае, перад ім дома ўласьнік мае рацыю, а да сьлёз галадаючых мацярэй і абадраных дзяцей яму якая справа? Беспрацоўныя перапоўнілі ўсе начлежкі, **—начуюць у калідорах, на сходах, туляцца з жонкамі і дзяцьмі ў чуланах і дрыўляных хлявох,—гэта ў той час, калі ноччу мароз даходзіць да 6 градусаў, жанчыны і дзеці хварэюць ад холаду і голаду.** Бывалі выпадкі, калі маткі на біржы працы заяўлялі, што ім застаецца толькі забіць дзяцей і пакончыць з сабой, калі ня будзе дана работа, або аказана дапамога.

А віды на работу—безнадзейныя. Беспрацоўе расьце, як сьнегавая лавіна. На 31 кастрычніка было зарэгістравана на біржы працы ў Рызе 6.500 беспрацоўных. Большасьць з іх сямейныя, і такім чынам пад ударамі голаду знаходзіцца **ня менш 20.000 чалавек.** Загадчык грамадзкіх работ міністэрства сацыяльнай апекі заявіў, што ніколі яшчэ беспрацоўе ў гэту пору года не дасягала такіх размераў: у гэтым годзе яно ў чатыры разы больш, чым у мінулыя гады. І няма надзеі на памяншэньне беспрацоўя, бо заводы скарачаюць вытворчасьць, адбываюцца масавыя звальненьні на чыгунках, у вёсцы спыняюцца палявыя работы і сэзоннікі адтуль варачаюцца ў гарады. Паводле думкі загадчыка грамадзкіх работ, у студзені-лютым лік беспрацоўных дасягне **30.000 чалавек.**

Тут маюцца на ўвазе толькі тыя беспрацоўныя, якія рэгіструюцца на біржы парады. Але калі прыняць пад увагу, што значная частка беспрацоўных не рэгіструецца зусім (бо лічыць атрыманьне работы праз біржу працы безнадзейнай справай), дык можна сказаць, што агульны лік беспрацоўных у Латвіі зімой дасягне **40-50.000 чалавек,** іншымі словамі—зімой будуць галадаць ня менш 100.000 чалавек, калі лічыць і сем'і беспрацоўных, інакш гаворачы—прыблізна на **кожныя 20 чалавек Латвіі, дзе ўсё насельніцтва не дасягае 2.000.000 будзе адзін галадаючы. Гэта ў лепшым выпадку.**

Голад і галеча, такія вялікія, што выклікаюць трывогу нават буржуазіі (бо галодны чалавек неперадзіны і можа даставіць буржуазнаму грамадзтву шмат непрыемнасьцей). Буржуазія ў Латвіі, як і ў іншых буржуазных краінах, прабуе ўсякага роду падачкамі адчаініцца ад сапраўднай дапамогі беспрацоўным.

Зразумела, ня прыходзіцца ад латвійскага буржуазна-кулацкага ўраду чакаць абкладаньня домаўласьнікаў, фабрыкантаў і гандляроў асобнымі падаткамі на карысьць беспрацоўных ці арганізацыі грамадзкіх работ у шырокіх разьмерах. Характэрна, што для «зьмягчэньня» беспрацоўя буржуазны «гласны» Рыскай гарадзкой управы Садоўскі прапанаваў... скараціць зарплату беспрацоўным, занятым на грамадзкіх работах з 2 лат да 1 лату 50 сантымаў для мужчын і да 1-20 сант. для жанчын (адзін лат—37 з пал. кап.). Вось куды вядзе буржуазная мудрасьць.

А тысячы галадаючых дзяцей латвійскіх пралетараў тым часам усё выразьней адчуваюць над сабой павісшую пагрозу галоднай сьмерці.

Янсон.

Наступленьне прадпрыемцаў на зарплату ва Францыі

ПАРЫЖ, 1. Унітарная фэдэрацыя (рэвалюцыйная) мэталістаў зьвярнулася да рабочых суднабудаўнікоў усіх краін з заклікам аб'яднацца супроць наступленьня капіталу. У адозьве ўказваецца, што прадпрыемцы прыступілі да масавага звальненьня рабочых на вэрфях. Адміністрацыя дабіваецца рэзкага скарачэньня зарплаты. **У Сэн-Казэры,** дзе занята 8 тыс. суднабудаўнічых рабочых, адміністрацыя вэрфей ужо абвясьціла аб сваім рашэньні зьнізіць зарплату **на 20%.** Унітарны прафсаюз мэталістаў заклікае ўсіх рабочых суднабудаўнікоў стварыць адзіны пралетарскі фронт, не дапускаць зьнижэньня зарплаты, дабівацца ажыцьцяўленьня 7-гадзіннага рабочага дня, скасаваньня звыштэрміновых работ і не дапускаць далейшых звальненьняў рабочых.

Пад відам усё ўзрастаючага дэфіцыту чыгунак, **які дасягае зараз 8-ми млн. франкаў у дзень,** чыгуначныя кампаніі дабіваюцца безадкладнага зьмяншэньня зарплаты абслугоўваючага пэрсаналу **на 20 проц.** зьнижэньня падаткаў на даходы кампаніі і павялічэньня чыгуначных тарыфаў. Урад ужо падрыхтаваў дэкрэт аб павышэньні чыгуначных тарыфаў і аб скарачэньні **больш чым 80 тыс. чалавек чыгуначнікаў.**

Паведамленьні

— **ПК ЦКК КП(б)Б** просіць тав. ВЕРАМЕЕНКА А. (б. дырэктара саўгасу «Залог пяцігодкі») зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б, ці паведаміць свой адрас. Просьба да ўсіх арганізацыяў і т. т., якія ведаюць месца знаходжаньня тав. Верамеенка, паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая, 55).

— Менгарком КП(б)Б прапануе члену КП(б)Б тав. НАВІЦКАМУ, які працаваў раней у саўгасе «Тарасава», Ратамскага сельсавету, абавязкова зьявіцца ў Гарком пакой № 11.

— Менгарком КП(б)Б паведамляе ўсе парткалектывы, ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ установы гораду і прыгарадны сельсавет, што з 1-га сьнежня г. г. Гарком КП(б)Б і ЛКСМБ пераходзяць на адзіны выхадны дзень—6, 12, 18, 24, 30 кожнага месяца.

У паказаныя дні апараты працаваць ня будуць, а будуць устаноўлены для журстры.

— 4-га сьнежня Менгарсавет СПВ і 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Красаасьветы, пак. № 18 скліча нараду сакратароў яч. і антырэлігійны актыў вытворчых і савецкіх устаноў.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Чырв. Зорка Пач. 6, 7-30, 9, 10-30 — Гарольд Лёйд у фільме Баязьлівасьць да жанчын. Камэдыя ў 8 частках.

„КУЛЬТУРА" Пач: 7, 8-40, 10-20 — СВОЙ ХЛОПЕЦ кіно-аповесьць у 6 частках. ШАХМАТКАЯ ГАРАЧКА—камэдыя. Кіно-хроніка Белдзяржкіно № 21.

„Інтэрнацыянал" Адкр. з 12 г. дня — У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ (Плывы, дзікачына, плывы) Кіно-нарыс вытв. Саюзкіно

„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня — Сёньня апошняя 2-я серыя ДЖАНКІ у 7 ч. Пачатак у 2 г. дня

„Юкы Піянэр" (бурынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ПАРТФОЛЬ ДЫЙКУР'ЕРА Звыш праграмы.—хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" К все адкр. з 5 г. — НІНІШ у 8 част. У галоўн. ролі ОСІ АСВАЛЬД. Пачатак сэансаў: 7, 9 і 10-45 м.

Гарпрафсаветам і ГарМБІТ'ам сёньня, 4 сьнежня, праводзіцца **агульна-гарадзкі зьлёт ІТР сельскай гаспадарки (агра-спэцыялістаў)**

па пытаньні рэалізацыі пастановы лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б і ЦКК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

На гэты зьлёт ўкліканы ўсіх агра-спэцыялістаў, якія працуюць ва ўсіх гарадзкіх установах і навукова-дасьледчых станцыях на тэрыторыі прыгараднага раёну, абавязкова.

Зьлёт адбудзецца ў вялікай залі Гарсавету (пляц Волі) роўна ў 7 гадзін вечара.

Старшыня Гарпрафсавету ШУЛЬКІН.

Старшыня ГарМБІТ СЬМІРНОЎ.

Выдавецтва „Зьвязда" просіць іншагародніх падпісчыкаў,

пры падпісцы на газэты „Зьвязда", „Орка", „Рауд. Артаус", „Рабселькор" і часопісі „Бальшавік Беларусі" і „Бел. Работніца і Калгасьніца",

не пасылаць у адрас выдавецтва грашовых пераводаў, а здаваць падпіску і грошы ў свае бліжэйшае паштовае аддзяленьне, што забясьпечае акуратную дастаўку выданьня.

Пры Менскім Архітэктурна-Будаўнічым Тэхнікуме з 1-га студзеня 1932 году адкрываюцца 12-цімесячныя

КУРСЫ

па падрыхтоўцы тэхнікаў-будаўнікоў

без адрыву з вытворчасьці, з 2-ма аддзяленьнямі:

1) Тэхнікаў-прарабаў.
2) Тэхнікаў-кашгарысьнікаў.

Курсы разьлічаны на рабочых з вытворчасьці са стажам ня менш аднаго году. Яны маюць падрыхтоўку ў аб'ёме 7-мігодзі (ФЗС, графшкола, ня скончаная сярэдняя тэхнічная адукацыя і г. д.)

Прыём заяў да 20-XII—31 г.

Анкеты атрымаць у канцылярыі Архітэктурна-Будаўнічага Тэхнікуму, вул. Карла Маркса, № 37.

Да анкеты прыкласьці дакументы, неабходныя для паступленьня ў Тэхнікумы, згодна дамедніка НКАсьветы.

Дырэкцыя Тэхнікуму.

5-га сьнежня ў 6 гадзін вечара у памяшканьні гарпрафсавету (пляц Волі, былое памяшканьне Наркамправы, пакой № 1, заля пасяджэньняў) адбудзецца **нарада-канфэрэнцыя нам. дырэктароў па рабочых прапановах і загадчыкаў сэктарамі вытворчасьці і плянаваньня ФЗК.**

НА ПАРАДКУ ДНЯ: 1. Аб ходзе выкананьня сацдагавору са Смаленскім ГСПС (інфармацыя з месц).

2. Аб правох і абавязках нам. дырэктароў па рабочых прапановах і практычных мерапрыемствах па выкананьні прамфінпляну на 4 квартал.

Нарада - канфэрэнцыя разьлічана на 2 вечары.

З прычыны важнасьці пытаньня абавязкова зьявіцца сваячасова.

Гарпрафсавет.

КУРСЫ 3-х месячныя **кіно-мэханікаў перасоўшчыкаў**

у Віцебску і Гомелі арганізуе **Белдзяржкіно** для вясковай кіно-сеці з 15 сьнежня 1931 г.

КУРСАНТЫ забясьпечваюцца стыпэндыяй па 45 руб. у месц і інтэрнатам (ці сродкамі на наём памяшканьня).

Прыём заяў да 12 сьнежня г. г. на адрасе: Курсы кіно-мэханікаў перасоўшчыкаў Гомель, Віцебск, Белдзяржкіно.

Неабходныя дакументы: 1) заява з абавязацельствам працаваць кіно-мэханікам-перасоўшчыкам на працягу 3-х год. 2) анкета зацьверджаная прафарганізацыяй, або савецкай арганізацыяй, 3) дакумент аб узросьце (мэтрыка), 4) аб адносінах да вайсковай павінасьці. 5) ня дычнае пасьведчаньне аб стане здароўя 6) аб матар'яльным і сацыяльным становішчы бацькоў 7) аб скончанай навучальнай установы ня ніжэй 4-х груп.

А КУРСЫ прымаюцца асобы ад 18 да 30 год. (мужчыны і жанчыны).

Даведку аб прыёме можна атрымаць ва ўсіх аддзяленьнях Белдзяржкіно (Менск, Гомель, Віцебск, Бабруйск, Ворша і ў Сэктары Кадраў Белдзяржкіно, Савецкая 90).

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

Заочныя Дзяржкурсы Росьпісу

РАЗРЫСОЎКІ па ўсемагч. тканінах. Фарбамі, рэльефн., алейн., малёва пырскамі. Прысыпкамі: бліскуч., бісаржэмчуг і інш.

Спосаб: нерасплыўч. анілину, празрыст. росьпісу мяккага золата, каляровага срэбра. Росьпіс тлінн., шилян. посуды, цэлюлёіда, скуры, дрэва. Да лекцый прыкладаецца звыш 200 малюнк. акрамя тэкставык.

Па скончаньні выд. пасьведчаньне.

Уменьне малёва, не патрэбна. Падрабязнасьці высыл. за 20 к. дробн. пошт. маркамі.

Масква, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.

Кошт публікацыі аб згубе дакум.-1 руб.

Вышаў з друку

Н. МЯШАЛКІНА-СІУКО і А. САВЕНАК

„ГУДОК"

АЛЬБОМ па грамаце і лічэньні для „0" груп.

Тыраж 20.000.